Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца
з 9 жніўня 1917 г.

7 ЛІПЕНЯ 2017 г. ПЯТНІЦА №128 (28492)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЗОРКА КУПАЛЫ



**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам урачыстага мерапрыемства, прысвечанага 135-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што святкаванні паспрыяюць праслаўленню творчых талентаў беларусаў.**
**— Зорка Янкі Купалы ўзышла ў пераломную эпоху, калі Беларусь рабіла першыя крокі да ўласнай дзяржаўнасці. Сілай свайго таленту паэт вызначыў шляхі развіцця роднай мовы і культуры, намеціў духоўныя арыенціры многіх пакаленняў. Таму сёння мы, грамадзяне суверэннай краіны, ганарымся і папулярызуем купалаўскую спадчыну, беражліва захоўваем яе для нашчадкаў, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка ў прывітанні.**

## Знайсці сваю зорку




Венера. Планета альбо зорка, багіня, статуя... Ці... звычайная вёска! Як і многія з нашых вёсак, летам Венера таксама папаўняецца дачнікамі, былымі жыхарамі, якія наведваюць родныя мясціны. Асабліва малечай, якую прывозяць да бабуль і дзядуль. І гэтыя, што на здымку, таксама бавяць летнія дзянькі на венерыных падворках, круцяць педалі сваіх веласіпедаў па адзінай вуліцы і збіраюць купальскія кветкі ў ваколіцах «зорнага» паселішча. Хочацца верыць, што калі-небудзь яны вернуцца на радзіму сваіх продкаў і стануць сапраўднымі гаспадарамі. І не дадуць знікнуць адзінай — незвычайнай назве на карце нашай краіны.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.** *Лагойскі раён.*

### *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Анатоль ЛІС, старшыня Брэсцкага аблвыканкама:**

*«Транспартным арганізацыям неабходна смялей укараняць новыя формы арганізацыі пасажырскіх перавозак. Маршрут трэба прапрацаваць такім чынам, каб гэта задавальняла ўсіх — было не стратна для горада і бюджэту і максімальна зручна для людзей. Галоўная ўмова — маршруты павінны быць загружаны. Гэта датычыцца ў прынцыпе канцэпцыі арганізацыі транспартнага забеспячэння ў горадзе і вобласці. Пры гэтым нагадаю, дзяржава ажыццяўляе датацыю на нерэнтабельныя гарадскія пасажырaперавозкі, выдзяляючы з бюджэту немалыя сумы на пакрыццё расходаў перавозчыку».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9714 | ▲ |
| Еўра | 2,2376 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0327 | ▼ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жыллёвая палітыка

## СПАЧАТКУ ДАПАМАГЧЫ ШМАТДЗЕТНЫМ

**А яшчэ начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ расказаў пра тое, што Указ пра новую сістэму адраснай дзяржпадтрымкі ў жыллёвым будаўніцтве быў падпісаны 4 ліпеня.**



### Каля 7 тысяч шматдзетных больш за тры гады ў чарзе

Паводле інфармацыі начальніка ўпраўлення, на пачатак гэтага года на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў было 30,5 тысячы шматдзетных сем'яў, з іх каля 7 тысяч стаяць на ўліку больш за тры гады. Па планах на 2017 год, у краіне будзе пабудавана за 3,5 млн квадратных метраў агульнай плошчы жылых памяшканняў, за студзень — май гэтага года ўведзена 1,42 млн «квадратаў». Чаканы ўвод за першае паўгоддзе складае 1,76 млн квадратных метраў. Што датычыцца будаўніцтва жылля з дзяржпадтрымкай, то, пры заданні на гэты год 450 тысяч «квадратаў», за пяць месяцаў уведзена 227,5 тысячы. Асноўныя фінансавыя рэсурсы дзяржпадтрымкі ў бягучым годзе накіроўваюцца на ўзвядзенне жылля для шматдзетных сем'яў. Сёлета для іх запланавана пабудаваць 4,5 тысячы кватэр і жылых памяшканняў. «Мы арыентуем выканкамы на тое, каб не толькі выканаць, але і перавыканаць гэта заданне, для таго каб паменшыць чаргу шматдзетных сем'яў», — сказаў ён. «Гэтыя лічбы ніжэйшыя, чым у мінулым годзе, што звязана з тым, што крыніц фінансавання ў 2017-м менш. У першую чаргу значна зменшыліся аб'ёмы дзяржпадтрымкі ў выглядзе льготных крэдытаў. Гэта падштурхоўвае да пошуку новых крыніц, схем фінансавання», — растлумачыў Аляксандр Горваль.

СТАР. 4

■ Фестывалім

## Александрыя чакае

**Заўтра на маляўнічым лузе каля Дняпра на мяжы паміж Магілёўшчынай і Віцебшчынай зноў будзе спяваць, танцаваць і ўражваць прыгожае купальскае свята «Александрыя збірае сяброў».**

Яго шматлікія пляцоўкі будуць працаваць з 11 гадзін суботняй раніцы і да 17 гадзін вечара нядзелі амаль бесперапынна. Канцэрты, гандлёвыя рады, атракцыёны, выставы, прэзентацыі, майстар-класы — часу сумаваць не будзе ні ў дарослых, ні ў дзяцей. Прысвечаная 500-годдзю беларускага кнігадрукавання і 135-годдзю народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа выстава «Друкарскі двор» пазнаёміць з лепшымі выданнямі кніжнай прадукцыі і прэзентуе кнігу, прысвечаную Спірыдону Собалю. Госці фестывалю ўбачыць аднаўлены вядомым калекцыянерам і гісторыкам Уладзімірам Ліхадзедавым друкарскі станок Францыска Скарыны.

Шмат цікавага можна будзе ўбачыць у горадзе сяброўства, дзе майстравыя людзі з розных краін свету прадэманструюць зробленыя сваімі рукамі шэдэўры народнага мастацтва. Моладзь зможа праверыць сябе на веданне традыцый купальскага свята і славянскай міфалогіі, прыняўшы ўдзел у захапляльнай квэст-гульні «У пошуках папараць-кветкі». Спецыяльны конкурс вызначыць пераможцу ў вырабе купальскіх вянкоў. Не пакінуць абыякавымі выступленні выхаванцаў коннаспартыўнай школы і магілёўскіх авіятараў. А яшчэ будзе магчымасць пабываць адначасова на папулярных народных святах «Уладар сяла» і «Вялікая бард-рыбалка».

Акрамя сучаснай феерыі «Купальская казка», якая стане апафеозам свята, адбудзецца фестываль феерверкаў з удзелам прадстаўнікоў замежных краін і ў суправаджэнні лазернага шоу.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# ПРЭЗІДЭНТ СУСТРЭЎСЯ З ЧЛЕНАМІ КАНГРЭСА ЗША

**Двухбаковыя адносіны сталі адной з тэм дыялогу. Да таго ж госці са Злучаных Штатаў адзначылі ролю Мінска ва ўрэгуляванні крызісу на ўсходзе Украіны. А таксама падтрымалі ініцыятывы, агучаныя на пляцоўцы 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ.**

Нагадаем, што Аляксандр Лукашэнка на адкрыцці сесіі ПА АБСЕ звярнуў увагу на неабходнасць аднаўлення агульнаеўрапейскага дыялогу, магчыма, і ў пашыраным фармаце. Да таго ж актуальным падаецца эканамічнае збліжэнне інтэграцыйных саюзаў, а таксама аб'яднанне намаганняў у барацьбе з тэрарызмам, рэгуляванні міграцыі і захаванні кібербяспекі.

Падчас сустрэчы Прэзідэнт Беларусі выказаў думку, што візіт такой прадстаўнічай дэлегацыі з ЗША (усяго ў Мінск прыехала 35 чалавек, у тым ліку 11 членаў Палаты прадстаўнікоў Кангрэса) дазволіць шчыра абмеркаваць надзённыя пытанні ўзаемаадносін. Да таго ж некаторыя з членаў Кангрэса даволі працяглы час разглядаюць тэму ліквідацыі наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, таму Прэзідэнт прапанаваў наведаць раёны, якія пацярпелі ад катастрофы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што зацікаўленасць у развіцці паўнавартасных партнёрскіх адносін з ЗША застаецца нязменнай. «За апошнія два-тры гады мы аднавілі пэўны ўзровень палітычнага даверу, а гэта без узаемнага жадання было б немагчыма. Лічу, што папярэдняе дзесяцігоддзе, якое мы пражылі ва ўмовах нявызначанасці, санкцый, — гэта перыяд упушчаных магчымасцяў для нашых адносін», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Зараз дынаміка развіцця беларуска-амерыканскага супрацоўніцтва некалькі спала, але выхад з гэтага «дэфіцыту ідэй» знайсці магчыма. Члены Кангрэса ЗША таксама могуць паспрыяць актывізацыі партнёрства. Развіццё адносін, перш за ўсё, ідзе ў галінах, дзе супадаюць беларуска-амерыканскія інтарэсы: забеспячэнне глабальнай і рэгіянальнай бяспекі, прадухіленне незаконнага транзіту ядзерных матэрыялаў, барацьба са злачыннасцю ў сферы высокіх тэхналогій, узаемадзеянне ў культуры і навуцы і іншае.

Прэзідэнт падкрэсліў неабходнасць працягваць дыялог па адчувальных тэмах — гэта эфектыўны механізм збліжэння пазіцый. Ён дазволіць прасоўвацца наперад да актыўнага супрацоўніцтва. Пазіцыя амерыканскага боку ў галіне правоў чалавека і дэмакратыі вядома, і Беларусь гатова абмяркоўваць гэтыя тэмы.

Кіраўнік дэлегацыі, старшыня Камісіі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Кангрэса ЗША, сенатар Роджэр Уікер адзначыў, што бачыць магчымасці для станоўчых змен і новых сумесных дасягненняў у двухбаковым супрацоўніцтве.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

# Крок насустрач

**Падчас сустрэчы старшыня Савета Рэспублікі Беларусі Міхаіл МЯСНІКОВІЧ і старшыня Камісіі па еўрапейскіх пытаннях Палаты дэпутатаў парламента Румыніі, кіраўнік дэлегацыі парламента Румыніі ў ПА АБСЕ Віктар-Віярэл ПОНТА абмяркавалі пытанні міжпарламенцкага супрацоўніцтва і закранулі перспектывы двухбаковых адносін.**

— Міжпарламенцкае супрацоўніцтва летась ужо пачало набіраць абароты. Мяркую, што наша цяперашняя сустрэча дасць ім дадатковы імпульс, — сказаў Міхаіл Мясніковіч.

На 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ, адзначыў Міхаіл Мясніковіч, агучваецца шмат цікавых ідэй. На яго думку, поспех сесіі ўжо бачны, таму што прысутнічае давер, сумленнасць адносін і ўзаемапавага адзін да аднаго падчас абмеркавання пытанняў парадку дня, новых ідэй і прапаноў. Парламентарый звярнуў увагу на тыя ініцыятывы, якія згадаў Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, ключавую прапанову пра тое, што Мінск гатовы ўзяць на сябе пэўную ролю ў арганізацыі дыскусіі па новым Хельсінкскім працэсе.

— Праблем у Еўропе назапасілася шмат, як новых, так і застарэлых, і іх не трэба замоўчваць, — падтрымаў выказванне Прэзідэнта старшыня Савета Рэспублікі. — Я прачытаў інтэрв'ю спадарыні Меркель, яна таксама гэтым занепакоена, але вельмі слушна заўважыла, што не трэба хаваць праблемы пад стол. І мне падаецца, што мінская пляцоўка магла б быць дастаткова камфортнай для абмеркавання гэтых і іншых пытанняў. Мы не заангажаваны па нейкіх блокавых абавязках і таму маглі б імкнуцца да забеспячэння парытэтнасці, уважліва адносіцца да тых праблем, якія будуць сфармуляваны ўдзельнікамі дыскусій.

Са свайго боку кіраўнік дэлегацыі парламента Румыніі ў ПА АБСЕ адзначыў, што яго зацікавіла, як Беларусь дастаткова паспяхова развівае адносіны з многімі еўрапейскімі краінамі. Віктар-Віярэл Понта таксама выказаў меркаванне, што нашы краіны павінны працаваць разам для развіцця двухбаковых эканамічных адносін.

**Рагнеда ЮРГЕЛЬ.**
*yurgel@zviazda.by*

# НАШЫ ВЫДАТНІКІ

**Аляксандр Лукашэнка павіншаваў выпускнікоў вышэйшых ваенных вучэбных устаноў з заканчэннем навучання і іх старэйшых калег — з прысваеннем генеральскіх званняў.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Беларусь праводзіць міралюбівую шматвектарную знешнюю палітыку, аднак у прыярытэце застаюцца нашы нацыянальныя інтарэсы, якія неабходна адстойваць усімі даступнымі спосабамі. У гэтым пытанні мы можам абаперціся як на ўласныя сілы, так і на ваеннае супрацоўніцтва з дружалюбнымі нам дзяржавамі.

«Без добра падрыхтаваных і аснашчаных Узброеных Сіл не можа быць суверэннай Беларусі. Яны прызваны забяспечыць тэрытарыяльную цэласнасць і стабільнасць дзяржавы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Цяпер у войскі паступае сучасная тэхніка, напрыклад самалёты Як-130, верталёты Мі-8, зенітныя ракетныя комплексы Тор-М2. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што менавіта сённяшнім выпускнікам ваенных навучальных устаноў прыйдзецца асвойваць усё новае і перадаваць веды калегам. Дарэчы, у верасні пройдзе сумеснае стратэгічнае вучэнне узброеных сіл Беларусі і Расіі «Захад-2017».

Перад выпускнікамі ВНУ сістэмы МНС цяпер стаіць шэраг задач, у тым ліку палепшыць грамадзянскую абарону краіны і гарантаваць бяспеку пры будаўніцтве Беларускай атамнай станцыі.

Прэзідэнт заўважыў, што «з улікам узрастання тэрарыстычнай небяспекі ў свеце, актывізацыі незаконнай міграцыі, распаўсюджвання наркотыкаў, увозу зброі неабходна ўдасканальваць сістэму гарантавання пагранічнай бяспекі дзяржавы». Гэтыя ж фактары ўплываюць на грамадскую бяспеку, таму трэба паляпшаць работу органаў унутраных спраў.

Падзяка Прэзідэнта Беларусі за выдатныя поспехі ў навучанні і ўзорнае выкананне воінскага абавязку была аб'яўлена 16 выпускнікам, у тым ліку выпускніку факультэта Генеральнага штаба Узброеных Сіл Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь, палкоўніку Ігару Залатару. Ён запэўніў, што, атрымаўшы сучасную адукацыю, працягне ўдасканальваць прафесійнае майстэрства і рэалізуе на практыцы ўвесь патэнцыял ведаў. Таксама на цырымоніі тром палкоўнікам было прысвоена чарговае воінскае званне генерал-маёра, а намесніку старшыні Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Аляксандру Багдзевічу — персанальнае званне дзяржаўнага саветніка мытнай службы III рангу.

**Надзея АНІСОВІЧ.**
*anisovich@zviazda.by*

# Абараніць людзей, спыніць канфлікты

**Учора падчас работы 26-й летняй сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ ўдзельнікі разглядалі пытанні, прысвечаныя дэмакратыі і правам чалавека, эканоміцы, навуцы, тэхналогіям, а таксама аспектам бяспекі і стану навакольнага асяроддзя.**

## Міграцыя па-ранейшаму актуальная

На пленарным пасяджэнні была выказана думка пра тое, што ПА АБСЕ павінна палепшыць работу па пытанні міграцыі. Яе агучыў кіраўнік швейцарскай дэлегацыі, намеснік старшыні Камісіі па палітычных пытаннях парламента Швейцарыі Філіпа ЛАМБАРДЗІ:

— Нашы папярэднія высновы заключаюцца ў тым, што міграцыя і патокі бежанцаў не спыняцца. Гэта, магчыма, ілюзія СМІ або частка грамадскай думкі — быццам цяпер ёсць іншыя праблемы, і нам не прыйдзецца больш займацца пытаннямі міграцыі. Мы павінны ўзмацніць работу ў рамках Парламенцкай асамблеі, каб забяспечваць маніторынг таго, што адбываецца, і прапанаваць нешта нашым урадам.

Для вырашэння праблемы міграцыі неабходны сур'ёзны падыход і комплекс мер, пагадзіліся ўдзельнікі пленарнага пасяджэння. Першым этапам вырашэння гэтага пытання абавязана стаць паўсядзённая праца. Вастрыня сітуацыі заключаецца ў тым, што падчас пераходу ў тую ці іншую краіну мігранты знаходзяцца ва ўмовах, якія пагражаюць стану іх здароўя. Акрамя таго, многія людзі сутыкаюцца са злачыннымі групоўкамі, якія ў сваіх мэтах выкарыстоўваюць мігрантаў. Падобных злачынцаў неабходна нейтралізаваць, што магчыма толькі пры сумеснай працы ўсіх краін — удзельніц АБСЕ — менавіта да такой высновы прыйшлі ўдзельнікі пасяджэння. Таксама дзяржавы абавязаны працаваць разам, каб вырашыць такую праблему, як тэрарызм, паколькі гэта з'яўляецца адным з фактараў масавых уцёкаў людзей са сваіх краін.

## Праблемы, ад якіх не ўцячы

Аспектам клімату і экалогіі павінна быць удзелена асаблівая ўвага, заявіў член дэлегацыі Расійскай Федэрацыі Аляксандр ФОКІН на пасяджэнні Агульнага камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі.

— Сённяшнія пытанні экалогіі і клімату — адны з прыярытэтных кірункаў работы нашай арганізацыі. Мы прыйшлі да тэмы, якую неабходна не толькі рэгулярна абмяркоўваць, але і казаць пра тое, што мы маглі б сумесна зрабіць, — адзначыў Аляксандр Фокін. — Таму я хацеў бы звярнуцца да кіраўніцтва і прапанаваць прысвяціць будучую восеньскую сесію Парламенцкай асамблеі АБСЕ праблемам клімату.

Па словах парламентарыя, увагу варта ўдзяліць газам, у прыватнасці — метану. «Ён вылучаецца пры здабычы нафты, пры здабычы вугалю, пры вядзенні геаразведкі з мэтай здабычы выкапняў. Таксама нас хвалюе сітуацыя ў атамнай галіне», — дадаў Аляксандр Фокін.

## Пытанне правоў чалавека — комплекснае

Падчас пасяджэння Агульнага камітэта па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях ад беларускага боку выступаў Сяргей РАХМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы. У сваёй прамове ён адзначыў, што наша краіна выказваецца супраць палітызацыі праблемы правоў чалавека, і што пытанне гэта комплекснае.

«Што датычыцца Беларусі, гэты комплексны падыход звязаны з забеспячэннем дабрабыту грамадзян і спрыяльных умоў пражывання. Вы можаце пераканацца ў тым, што ў Беларусі вельмі бяспечна, цудоўныя ўмовы для жыцця, высокі экалагічны патэнцыял. Увесь гэты комплекс дазваляе Беларусі адчуваць сябе ўпэўнена ва ўсіх сферах, у тым ліку пры захаванні правоў чалавека. Пры гэтым мы згодны з тым, што трэба пастаянна ўдасканальвацца ў гэтым кірунку», — лічыць сенатар.

## Вяртанне да мірнага працэсу

Кіраўнік Спецыяльнай маніторынгавай місіі АБСЕ на Украіне Эртурул АПАКАН на пасяджэнні Агульнага камітэта па палітычных пытаннях і бяспецы заявіў, што ўдзельнікі Мінскіх пагадненняў не выконваюць сваіх абавязацельстваў.

— Агульнае паразуменне ў нас ёсць — аб тым, што настаў час спыніць напружанасць, якая там існуе. На жаль, гэтага не адбываецца, — адзначыў кіраўнік маніторынгавай місіі. — Мы лічым, што эскалацыя канфлікту існуе, прысутнічае гвалт, адбываецца і стральба. Хоць гаворка ішла аб вывадзе рознага ўзбраення, але яго выкарыстанне сведчыць аб тым, што тыя, хто падпісаў пагадненне, не выконваюць сваіх абавязацельстваў.

Член дэлегацыі Расійскай Федэрацыі, кіраўнік камітэта Дзярждумы па міжнародных справах Леанід СЛУЦКІ у адказ адзначыў, што ацэнкі і даклады павінны грунтавацца на высокай адказнасці за лёс людзей. «Расія не з'яўляецца бокам Мінскіх пагадненняў, бакамі з'яўляюцца Кіеў і паўднёва-ўсходнія рэгіёны Украіны. Расія з'яўляецца ініцыятарам і актыўным удзельнікам Мінскага працэсу, будзе і надалей садзейнічаць нармалізацыі сітуацыі ў гэтым рэгіёне», — дадаў Слуцкі.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**
*lukashevich@zviazda.by*
**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

# Супраць спайсаў

**Наша краіна прадставіла адпаведную рэзалюцыю.**

У другі дзень работы Парламенцкай асамблеі АБСЕ Беларусь правяла шэраг дадатковых мерапрыемстваў. Адно з іх было прысвечана рэзалюцыі пад назвай «Распрацоўка своечасовых і эфектыўных заканадаўчых, нарматыўных, адміністрацыйных мер рэагавання на з'яўленне новых псіхаактыўных рэчываў». Такім чынам беларускі бок імкнецца прыцягнуць увагу самай шырокай грамадскасці да праблемы лавінападобнага ўзнікнення новых псіхаактыўных рэчываў.

У сваёй прамове падчас мерапрыемства Баляслаў ПІРШТУК, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі, адзначыў, што цяпер новыя псіхаактыўныя рэчывы не падпадаюць пад дзеянне трох асноўных міжнародных канвенцый у сферы барацьбы з наркотыкамі.

Беларуская дэлегацыя ініцыявала ў ПА АБСЕ сваю рэзалюцыю, паколькі своечасовыя і эфектыўныя заканадаўчыя меры рэагавання на нацыянальным узроўні ў такіх умовах набываюць вырашальнае значэнне. Дарэчы, рэзалюцыю беларускіх дэлегатаў ужо падтрымалі 44 парламентарыі з 20 краін. «Гэта сведчыць аб тым, што праблема новых псіхаактыўных рэчываў актуальная і патрабуе неадкладнага вырашэння», — адзначыў дэпутат.

**Вераніка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

## ■ Прыёмная кампанія — 2017

# Тры ЦТ за пяць дзён

**Для праходжання цэнтралізаванага тэсціравання ў рэзервовыя дні зарэгістраваліся 733 абітурыенты. Летась свае права скарыстацца дадатковай магчымасцю змаглі пацвердзіць 797 чалавек, але здаць яны маглі толькі адзін прадмет.**

З 2017 года ў абітурыентаў з'явілася магчымасць здаваць у рэзервовыя дні тры дысцыпліны і такім чынам не губляць цэлы год, напрыклад, па прычыне хваробы. Праўда, графік здачы экзаменаў атрымліваецца даволі шчыльны (6, 8 і 10 ліпеня). Праходзіць выпрабаванні па трох прадметах будуць 25 чалавек, а 84 абітурыенты запісаліся на тэсціраванне па двух прадметах. Найбольшая колькасць абітурыентаў будуць здаваць рускую мову (226 чалавек) і матэматыку (134 чалавекі).

Кожны зварот па дазвол удзельнічаць у ЦТ у рэзервовыя дні разглядаўся індывідуальна. Да ўважлівых прычын адносіцца хвароба, а таксама ўдзел у міжнародных спаборніцтвах... Паколькі ўступныя выпрабаванні здаюць не толькі выпускнікі школ і гімназій, але і людзі, якія працуюць, іх адсутнасць можа быць абумоўлена вытворчай неабходнасцю: чалавек знаходзіўся ў камандзіроўцы... Ёсць і чыста тэхнічныя прычыны, напрыклад затрымаўся рэйс самалёта, спазніўся прыгарадны ці міжгародні аўтобус.

А вось абітурыентам, якія не трапілі на іспыты ў асноўны дзень, бо не мелі з сабой пашпарта (захапілі, напрыклад, толькі яго копію ці пасведчанне кіроўцы), пераздачу не дазваляюць. Тое, што пашпарт «быў у пасольстве на візе», таксама не лічыцца ўважлівай прычынай. Тэрміны правядзення ўступнай кампаніі вядомыя даўно, таму трэба загадзя вызначацца, што важнейшае: паехаць на адпачынак ці атрымаць вышэйшую адукацыю. Выключэнняў нікому не робяць...

Пунктам правядзення цэнтралізаванага тэсціравання па ўсіх вучэбных дысцыплінах у рэзервовыя дні вызначаны Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

## ■ Экзатычны адпачынак

### Трактар — сваімі рукамі

**Незвычайную паслугу пачаў прапаноўваць ахвотным Мінскі трактарны завод. 5 ліпеня ўпершыню ў гісторыі прадпрыемства ўдзел у зборцы трактароў прынялі турысты. Пра гэта паведаміў спецыяліст МТЗ па рабоце сярод моладзі Сяргей СІДАРОВІЧ.**


Фота БЕЛТА.

**Турыст з ЗША Ханц Хаймбургер.**

Удзел у вытворчасці сусветна вядомага трактара ўзяла інтэрнацыянальная каманда з пяці чалавек: трох беларусаў, амерыканца і швейцарца. У корпусе зборкі яны выканалі пяць аперацый на канвееры, у тым ліку ўстаноўку элементаў рулявой цягі. Апранууўшы на сябе спецадзенне прадпрыемства, прамысловыя турысты будуць працаваць пад наглядам спецыялістаў МТЗ. Сабраныя трактары пазней, як і іншыя, адправяцца на рэалізацыю. Пасля завяршэння работы першыя наведвальнікі атрымалі сертыфікаты аб удзеле ў працэсе зборкі трактара.

Кошт такой забавы дастаткова дэмакратычны — усяго 9 рублёў. Апошнім часам МТЗ актыўна развівае прамысловы турызм. Ад пачатку года на заводзе пабывала больш за 1360 экскурсантаў, з іх звыш 300 замежных гасцей з 23 краін, у тым ліку з Нігерыі і Аўстраліі.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.** *lyskavets@zviazda.by*

■

## ■ На слыху

### НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ТАНЦЫ Ў БАБРУЙСКУ

**Беларускія трактары танцуюць не толькі ў сталіцы на дзень нараджэння МТЗ і на парадзе ў гонар Дня Незалежнасці.**




**Інтэрнэт-мем МТЗ: «Захоўвай спакой і рулі трактарам». (Мем — адзінка культурнай тэматыкі, якая здольная хутка распаўсюджвацца.)**

Упершыню яны выканалі танцавальны нумар у Бабруйску ў дзень святкавання 630-годдзя горада. Жыхарам і гасцям больш чым з 30 краін свету, якія прыбылі на міжнародны фестываль «Вянок дружбы», паказалі прэм'еру танцавальна-харэаграфічнага нумара, галоўныя партыі ў якім выканалі трактары «Беларус-320.4» вытворчасці «Бабруйскага завода трактарных дэталяў і агрэгатаў».

Група з шасці трактароў «Беларус-320.4», якімі кіравалі работнікі завода, апраўдала чаканні некалькіх тысяч гледачоў. Прадстаўленне было выканана з высокім прафесіяналізмам у кожным руху. Важнай адметнасцю нумара, пастаўленага **галоўным рэжысёрам гарадскога палаца мастацтваў Анатолем БРЫЧЭНКАМ**, якая адрознівала яго ад таго, што было раней паказана ў Мінску, стала музычнае суправаджэнне. Яго выканаў жывы аркестр. Як адзначаюць спецыялісты па турызму, далейшае развіццё новага кірунку «трактарнага мастацтва» можа зрабіць яго адной з візітных картак не толькі Бабруйска, але і Беларусі ў цэлым.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.** *Kryzhevich@zviazda.by*

■

## ■ Надвор'е

# Няўжо пацяплее?

### У панядзелак сіноптыкі абяцаюць месцамі да 28 цяпла

**Праўда, істотнае пацяпленне прыйдзе не сёння, калі краіна ў асноўным знаходзіцца ў полі павышанага атмасфернага ціску. Толькі на паўночным усходзе Беларусі адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы, якая паступае з Балтыйскага мора, паведаміла галоўны сіноптык Белгідраметцэнтра Святлана РЫБАКОВА.**

Чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў, толькі на паўночным усходзе ў асобных раёнах невялікія кароткачасовыя дажджы. Вецер паўночна-заходні, умераны, на паўночным усходзе парывісты. Максімальная тэмпература паветра ўдзень ад плюс 16 да плюс 21 градусаў, а на паўднёвым захадзе да 23 цяпла. Атмасферны ціск істотна не зменіцца. У суботу мы будзем пад уплывам вобласці павышанага атмасфернага ціску, на паўднёвым захадзе адаб'ецца ўплыў атмасфернага фронту. Будзе пераважна без ападкаў, толькі на паўднёвым захадзе пройдуць кароткачасовыя дажджы, удзень магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 5—12 градусаў цяпла, па паўднёвым захадзе да 14 цяпла, максімальная ўдзень — ад плюс 18 да плюс 25 градусаў.

У нядзелю надвор'е ізноў крыху сапсуецца. Да нас завітае атмасферны фронт, які перамяшчаецца з Заходняй Еўропы, і толькі ўначы на ўсходзе краіны захаваецца ўплыў вобласці павышанага атмасфернага ціску. Таму ўначы па заходняй палове, а ўдзень на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах прагрымяць навальніцы. Тэмпература паветра ўначы 7—14 цяпла, а максімальная ўдзень — ад плюс 16 да плюс 23 градусаў, па паўднёвым захадзе да 25 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, на наступным тыдні ў нас пачне цяплець. У панядзелак будзе пераважна без ападкаў. Уначы чакаецца 7—14 цяпла, удзень ад плюс 19 да плюс 25 градусаў, а па паўднёвым захадзе да 28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении повторных торгов в виде открытого аукциона по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ОАО «Белремстройсвязь» Филиал № 6**

Лот № 1 в составе: **Капитальное строение с инв. № 710/С-40825 - Здание склада**, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, 37, общ. пл – 187,3 кв м, фундамент - бетонный, стены – кирпичные, крыша – шифер, полы – бетонные, г.п. – 1970

**Капитальное строение с инв. № 710/С-40824 – Одноэтажное, кирпичное административное здание**, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, п. Еловики, 37, общ. пл – 149,3 кв м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные, перекрытие – ж/бетонное, крыша – совмещенная, полы – бетонные, дощатые, линолеум, г.п. – 1960.

Сведения о земельном участке: здания расположены на земельном участке с кадастровым номером 741000000003000584, площадью – 0,2726 га, назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения (предоставлен на праве постоянного пользования).

***Первоначальная стоимость — 16 200,00 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка 1 620,00 бел. руб. с учетом НДС***

| | |
|---|---|
| **Продавец** | ОАО «Белремстройсвязь» Филиал № 6, УНП 700183719, г. Могилев, ул. Кулибина, 15 |
| **Расчетный счет для перечисления задатка** | Получатель платежа — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, номер счета в формате IBAN BY21BPSB30121543370109330000, BIC банка BPSBBY2X |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **Аукцион проводится 17 августа 2017 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 16 августа 2017 года до 15.00 |
| **Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества** | В течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи. |

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 22.04.17

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25**



**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| **Продавец** | ОАО «Реммех», 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 48 Тел. +375 (17) 291-83-47 |

**Предмет аукциона**

**Транспорт, спецтехника и оборудование, расположенные по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 48, в составе:

| № лота | Инв. номер | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб. с учетом НДС | Шаг аукциона, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | - | **Трактор Т-170Б** | 5 900,00 | 295,00 |
| 2 | 10024 | **Ножницы гильотинные НА 3225** | 8 660,64 | 433,03 |
| | 1112323 | **Тележка под гильотину с путями S32** | | |
| | 4194 | **Установка роликовая для резки** | | |
| 3 | 4211 | **Пресс-ножницы 3Н5222** | 1 292,40 | 64,62 |
| 4 | 5160 | **Сварочный полуавтомат Jack-leMIG 326 G** | 529,20 | 26,46 |
| 5 | 5158 | **Сварочный полуавтомат Jack-leMIG 500TS** | 630,00 | 31,50 |
| 6 | 999968 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 203,04 | 10,15 |
| 7 | 999969 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 203,04 | 10,15 |
| 8 | 1018 | **Полуавтомат Powertec 250C** | 243,60 | 12,18 |
| 9 | 10022 | **Полуавтомат Powertec 300** | 268,80 | 13,44 |
| 10 | 5077 | **Сверлильный станок 2Н135** | 451,68 | 22,58 |
| 11 | 4071 | **Станок токарно-винторезный 16 в-20** | 2 546,40 | 127,32 |
| 12 | 4035 | **Универсальный трубогибочный механизм ТГС-5** | 689,28 | 34,46 |
| 13 | 4591 | **Контейнер металлический, 2014 г. в.** | 74,40 | 3,72 |
| 14 | 41000001 | **Станок радиально-сверлильный 2Н55Ф2, 1971 г. в.** | 2 280,00 | 114,00 |
| 15 | 50 | **Станок заточной 3А64Д, 1972 г.в.** | 1 224,00 | 61,20 |
| 16 | 4032 | **Станок точильно-шлифовальный ТШ-3, 2006 г. в.** | 112,80 | 5,64 |
| 17 | 221 | **Станок универсально-заточной 3М-642, 1986 г. в.** | 1 272,00 | 63,60 |

**Изолированные помещения** в составе

| № лота | Инв. номер | Наименование (назначение) | Общая площадь | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 18 | 500/D-708145929 | **Административное помещение** | 408,9 кв. м | г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7 |
| | Начальная цена с НДС 20% - **91 994,95 белорусских рублей** Шаг аукциона: **4 599,75 белорусских рублей** | | | |
| **Обременения** | Арендатор. Подробная информация на сайте организатора аукциона. | | | |

**Объекты недвижимого имущества, в составе**

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 19 | **А 4/к-кп. Здание котельной** (Здание специализированное энергетики) | 1758,0 кв. м | 500/С-27612 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| | **Станция для перекачки конденсата литер М1/К** (Сооружение специализированное коммунального хозяйства) | 5,5 кв. м | 500/С-47974 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| **Сведения о земельном участке** | земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2049 г.) с общ. пл. **1,1998 га** для эксплуатации и обслуживания здания специализированного энергетики (здание котельной) и здания неустановленного назначения (здание котельной) (установленные ограничения: охранная зона водопровода, площадь 0,1228 га, охранная зона газопровода, площадь 0,0650 га) | | | |
| **Обременение** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **137 664,00 белорусских рублей** | | | |
| **Шаг аукциона** | **6 883,20 белорусских рублей** | | | |

**Здание контрольно-пропускного пункта**:

| № лота | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер | Адрес |
|---|---|---|---|---|
| 20 | **Здание контрольно-пропускного пункта** (Здание специализированное иного назначения) | 201 кв. м | 500/С-28266 | г. Минск, ул. Бабушкина, 48 |
| **Составные части и принадлежности** | Ворота металлические откатные, ограждения (железобетонное, металлическое), площадки (асфальтобетонное, бетонное, плиточное покрытия), площадка под оборудование (бетонное покрытие) | | | |
| **Сведения о земельном участке** | земельный участок предоставлен Продавцу на праве аренды (срок действия договора по 2051 г.) с общ. пл. **0,7151 га** для эксплуатации и обслуживания административно-бытового здания, здания ФОКа, здания КПП, здания неустановленного назначения | | | |
| **Обременение:** | Арендаторы. Подробная информация на сайте организатора аукциона. | | | |
| **Начальная цена с НДС 20%** | **136 011,60 белорусских рублей** | | | |
| **Шаг аукциона:** | **6 800,58 белорусских рублей** | | | |

**С подробной информацией по предметам аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона** WWW.CPO.BY

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом торгов осуществляется во вторник, среду и четверг с 9.00 до 16.00, перерыв с 12.00 до 13.00. Ответственное лицо: Чугунов Василий Иванович, и.о. главного инженера, контактный телефон МТС 80296635116 |

**Задаток 10%** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты: по лотам №№ 1—17** не более **10 (десяти) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**По лотам №№18—20** не более **30 (тридцати) дней** со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. №16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **WWW.CPO.BY**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5%

**Затраты** на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведение аукциона опубликовано в г. «Звязда» 21.06.2017 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **21.07.2017** в 15 00 по адресу: **г. Минск, ул. Бабушкина, 48, актовый зал, ОАО «Реммех».** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **19.07.2017** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** |
| **Контактные телефоны:** | +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by |

# СПАЧАТКУ ДАПАМАГЧЫ ШМАТДЗЕТНЫМ

## Тэрміны крэдытавання паменшаць

Таксама ён расказаў, чым будзе адрознівацца новая сістэма адраснай дзяржпадтрымкі. «У канцэпцыі Указа — захаванне катэгорый ільготнікаў, прапісаных ва Указе №13, які будзе працягваць дзейнічаць паралельна з новым Указам аб субсідзіраванні. Умовы, па якіх будзе аказвацца дзяржпадтрымка, крыху іншыя. Калі раней па Указе №13 тэрміны крэдытавання складалі 20 і 40 гадоў, то ў новым Указе тэрміны будуць да 20 гадоў», — растлумачыў Аляксандр Горваль.

Указ прадугледжвае прыцягненне крэдытных рэсурсаў камерцыйных банкаў. Не толькі Беларусбанк і Белаграпрамбанк будуць удзельнічаць у сістэме дзяржпадтрымкі, але і большасць камерцыйных банкаў. Фінансавая нагрузка на грамадзян, якія будуць атрымліваць субсідыі па новым Указе, застанецца на ўзроўні Указа №13. Калі па гэтым дакуменце кампенсацыя з бюджэту льготных крэдытаў ажыццяўляецца наўпрост банкам, то цяпер яна будзе рабіцца грамадзянам. Аляксандр Горваль адзначыў, што сэнс новага Указа заключаецца таксама ў тым, каб сыходзіць ад дырэктыўнага крэдытавання, якое крытыкуецца міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі. Ён накіраваны на тое, каб дзяржава падтрымлівала не банкі, а непасрэдна грамадзян.

Агульная сума субсідый пакуль невядома. Але пры гэтым эксперт адзначыў, што павінен усталявацца баланс паміж магчымасцямі бюджэту і аб'ёмамі крэдытных рэсурсаў, якія будуць выдаваць камерцыйныя банкі. Яны таксама павінны настроіцца на новую сістэму.

## Інфраструктуру — за ўласныя грошы?

Таксама Аляксандр Горваль адзначыў, што незабяспечанасць інфраструктурай тармозіць індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва. Трэба будаваць партнёрскія адносіны з дзяржавай, таму разглядаецца пытанне долевага будаўніцтва інфраструктуры. «Значны аб'ём гэтых выдаткаў будзе па аб'ектыўных прычынах перанесены на грамадзян, якія будуць будаваць ці ўжо будуюць, — сказаў Аляксандр Горваль.

**У апошні час значна зменшыліся плошчы кватэр. Карыстаюцца попытам кватэры-студыі са свабоднай планіроўкай.**

Паводле яго слоў, цікавасць да ўзвядзення загараднага жылля ўзрастае з году ў год. Тут ёсць пэўныя абмежаванні: недахоп рэальна запатрабаваных зямельных участкаў, забяспечаных інфраструктурай, і будаўніцтва гэтых аб'ектаў за ўласныя сродкі. «За апошнія два гады практычна не заключаліся новыя дагаворы на дзяржпадтрымку індывідуальнага жыллёвага будаўніцтва — з прычыны абмежаванасці сродкаў і неабходнасці выканаць абавязацельствы па раней заключаных дагаворах», — растлумачыў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Мінбудархітэктуры.

## Канкурэнцыя камерцыйнаму будаўніцтву

У Беларусі спрашчаецца ўваходжанне забудоўшчыкаў на рынак долевага будаўніцтва, паведаміў Аляксандр Горваль. Уносяцца змяненні ва Указ №263 аб долевым будаўніцтве. Разглядаецца магчымасць вымання з Указа пазіцый аб неабходнасці будаўніцтва 15% жылога дома за кошт сродкаў забудоўшчыка. Гэта датычыцца не ўсіх забудоўшчыкаў, а толькі ўпраўленняў капітальнага будаўніцтва і прадпрыемстваў з доляй дзяржуласнасці больш за 50%. «Ва УКБ у сувязі са зніжэннем аб'ёму будаўніцтва няма неабходных абаротных сродкаў, каб укласці 15%, а браць крэдыт — значыць падаражаць будоўлю. Акрамя таго, гарантам УКБ і дзяржпрадпрыемстваў з'яўляецца дзяржава. Для камерцыйнага рынку прапануем пакінуць абавязак будаваць не менш за 15%, перш чым выйдзе праектная дэкларацыя», — растлумачыў начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

**Сёння кошт 1 «квадрата» складае 770 рублёў з дзяржаўнай падтрымкай. З улікам інфляцыйных працэсаў яна павялічыцца. У прагнозе закладзены кошт 840 рублёў да канца года за 1 квадратны метр.**

Што датычыцца сістэмы жыллёва-будаўнічых зберажэнняў, Аляксандр Горваль растлумачыў, што яна прадугледжвае спецыялізаваны ўклад у камерцыйных банках і назапашвальны перыяд ад трох да пяці гадоў, за час якога грамадзянін абавязуецца назапасіць усталяваную дагаворам суму — працэнт ад кошту будучага жылля, які залежыць ад рашэння банка, у якім ён будзе крэдытавацца. Пасля гэтага яму выдаецца крэдыт на неабходную суму для будаўніцтва жылля. Падчас назапашвальнага перыяду грамадзянін атрымлівае пэўную падтрымку — дзяржаўную прэмію, якая заклікана кампенсаваць страты, магчымыя прычыны інфляцыйных працэсаў. «На перыяд крэдытавання стаўка па крэдыце будзе некалькі ніжэйшая, чым стаўкі, якія выдаюцца на жыллёвае будаўніцтва. Гэта дазволіць прыблізна траціне грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, вырашыць жыллёвае пытанне самастойна», — падкрэсліў Аляксандр Горваль.

## У сталіцы будуюцца толькі шматдзетныя з чатырма дзецьмі

На чарзе маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у Мінску стаяць больш як 208 тысяч сем'яў, з іх каля пяці тысяч — шматдзетныя, паведаміла **начальнік аддзела жыллёвага будаўніцтва камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Ірына ГОНТАРАВА.**

«Увесь аб'ём дзяржпадтрымкі, прадугледжаны на гэты год у Мінску, будзе накіраваны на фінансаванне будаўніцтва жылля толькі для шматдзетных сем'яў з чатырма і больш дзецьмі, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу больш за тры гады», — сказала Ірына Гонтарава. У гэтым годзе ў сталіцы плануецца ўвесці каля 650 тысяч квадратных метраў жылля, у тым ліку 160 тысяч «квадратаў» для чаргавікоў, каля 45 тысяч — для шматдзетных сем'яў. Для такіх сем'яў кватэры будуюць у асноўным у межах вуліц Міхалова — Алібегава. Да канца гэтага года там запланавана ўзвядзенне пяці жылых дамоў. Па адным доме плануецца ўвесці таксама ў Цэнтральным, Заводскім раёнах. «Мінгарвыканкам прыняў меры па пошуку найменш абцяжараных зямельных участкаў. Такія пляцоўкі былі выдзелены УКБ для будаўніцтва жылля для тых, хто мае патрэбу, — расказала Ірына Гонтарава. — Прыкладаем усе намаганні, каб максімальна скараціць чаргу шматдзетных сем'яў. Пляцоўкі ў Фрунзенскім раёне на вуліцах Шаранговіча, Гарэцкага, Міхалова, Алібегава прызначаны для ўзвядзення жылля для шматдзетных сем'яў, нават там, дзе раней планавалася пабудаваць камерцыйнае жыллё». Ну, а агульнагарадская чарга тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, амаль не рухаецца...




## Перспектывы будучых зносаў

Па словах Ірыны Гонтаравай, у цяперашні час у сталіцы фактычна не засталося свабодных зямельных участкаў для жыллёвага будаўніцтва. Забудова вядзецца ў асноўным з адсяленнем і зносам існуючых індывідуальных жылых дамоў. Згодна з дзяржаўнай праграмай на 2016—2020 гады ў Мінску запланавана штогод будаваць прыкладна 650 тысяч квадратных метраў жылля. Плануецца далейшае асваенне тэрыторый у межах вуліц Міхалова — Алібегава, Шаранговіча — Гарэцкага. Прадугледжана забудова мікрараёнаў Чыжоўка-6, Лошыца, тэрыторыі аэрапорта Мінск-1 з фарміраваннем дзелавога цэнтра «Мінск-Мір». Завершаць будаўніцтва ў межах вуліцы Макаёнка — праспекта Незалежнасці, тэрыторыі каля Нацыянальнай бібліятэкі. Запланавана таксама найбуйнейшая забудова для грамадзян, якія не стаяць на ўліку паляпшэння жыллёвых умоў, на тэрыторыі 1-й Мінскай птушкафабрыкі ў межах вуліц Арлоўскай — Нававіленскай. У перспектыве намечана забудова ў межах праспекта Машэрава — праспекта Незалежнасці — вуліцы Кісялёва — вуліцы Чырвоная на месцы былога тралейбуснага дэпо №1, а таксама забудова тэрыторыі завода «Гарызонт».

Некалькі слоў сказала спецыяліст пра перспектывы ўзвядзення жылых дамоў у гарадах-спадарожніках сталіцы. Пакуль сур'ёзная гаворка ідзе толькі пра забудову дамоў у раёне гарадскога пасёлка Рудзенск. Там з цягам часу можа быць пабудавана каля 630 тысяч квадратных метраў жылля.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*kurkach@zviazda.by*

■ **У тэму**

## 135 мільёнаў рублёў на падтрымку чаргавікам

**Як вядома, Прэзідэнт падпісаў Указ №240 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадзян пры будаўніцтве (рэканструкцыі) жылых памяшканняў». Гэты дакумент уводзіць адраснае субсідзіраванне ў будаўніцтве жылля.**

Дакументам у дадатак да дзеючай сістэмы льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва ўводзіцца новы від дзяржаўнай падтрымкі грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, — дзяржаўныя адрасныя субсідыі. Яны будуць давацца на выплату часткі працэнтаў за карыстанне крэдытам на будаўніцтва жылля, атрыманым грамадзянамі ў любым камерцыйным банку, а шматдзетным і маладым сем'ям і дзецям-сіротам — таксама на пагашэнне часткі асноўнага доўгу па такіх крэдытах.

Як адзначыў **начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Аляксандр ГОРВАЛЬ,** дзяржава зараз запланавала прыцягваць не толькі прамыя бюджэтныя рэсурсы на падтрымку жыллёвага будаўніцтва, але і рэсурсы банкаўскай сістэмы. Механізм Указа №240 дазволіць пашырыць аб'ём крэдытавання жыллёвага будаўніцтва, і пры гэтым яно будзе ажыццяўляцца з элементамі дзяржаўнай падтрымкі. Новы дакумент дазваляе разам з тым паменшыць выдаткі бюджэту. «Бюджэт будзе толькі кампенсаваць працэнты грамадзянам. Кампенсацыя будзе адрасная і для кожнага асобнага грамадзяніна, які будзе мець на гэта права», — растлумачыў Аляксандр Горваль.

Акрамя таго, ён дадаў, што памеры крэдытаў для льготнай катэгорыі грамадзян будуць набліжаны да тых памераў, якія цяпер атрымліваюць па Указе №13, але пры гэтым усё ж будуць даражэйшыя. «Для сям'і з трох чалавек пры ўмове, што стандартна мы забяспечваем іх 60 кв. м пры кошце 660 рублёў за кв. м, пад крэдыт 35 тысяч рублёў выплата па Указе №13 складала 224 рублі штомесяц, а будзе па Указе №240 — 347 рублі. Сям'я з 4 чалавек па Указе №13 плаціць 298 рублёў, па Указе №240 — 463 рублі. Для шматдзетных сем'яў, якія маюць траіх дзяцей, — 45 рублёў і 80 рублёў адпаведна. Для шматдзетных сем'яў, у якіх выхоўваюцца чацвёра дзяцей і больш, захоўваецца поўнае пагашэнне асноўнага доўгу і працэнтаў па крэдыце», — растлумачыў Аляксандр Горваль.

У цяперашні момант дапрацоўваецца план мерапрыемстваў па рэалізацыі Указа, каб скарэктаваць з ім шэраг прававых актаў. Адбывацца гэта будзе па працягу 4 месяцаў. Дакумент уступіць у сілу праз месяц пасля афіцыйнага апублікавання. Пад Указ ацэначна вызначана 135 мільёнаў рублёў — 65 мільёнаў рублёў Беларусбанка і 70 мільёнаў рублёў Белаграпрамбанка. У далейшым у долю ўвойдуць і шэраг іншых фінансавых устаноў. Зараз рыхтуецца пералік аб'ектаў, якія будуць фінансавацца за кошт субсідый.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ.**
*kryzhevich@zviazda.by*

# Пашукаем Перунову кветку

## Самыя вясёлыя забавы — у самую кароткую ноч лета

**Гэтымі днямі разам з камандай праекта «Наперад у мінулае», што выходзіць па нядзелях у эфіры тэлеканала «Беларусь 3», наш карэспандэнт вандруе па Піншчыне, дзе занатоўвае адметнасці правядзення жніўеньскіх абрадаў. А на працягу ліпеня аматары народнай песні даведаюцца, як у нашай краіне здаўна заклікалі дождж, ушаноўвалі святога Пятра на Пятровіцу і ладзілі гусінае свята. Мы пабываем на Любаншчыне, Клімавіччыне і Касцюковіччыне, дзе і пазнаёмімся з мясцовымі традыцыямі. Сёння ж зноў запрашаем на Жыткавіччыну, дзе разам з мясцовым фальклорным калектывам адзначым, бадай, самае летняе свята — Купалле.**



### Калі зямля ў росквіце

У даўнія часы жыццё нашых продкаў падпарадкоўвалася рытмам, зададзеным самой прыродай. Зімовы адпачынак ад працы ў полі змяняўся клопатам пра будучы ўраджай увесну, рытуаламі на абарону пасеваў летам, лёгкае паспяховае жніво ў пачатку восені. Таму і свята росквіту зямлі — Купалле — лічыцца адным з найярчэйшых у беларускім календары. Яно прымяркоўвалася (ды і сёння прымяркоўваецца) да летняга сонцастаяння і адзначаецца з 6 на 7 ліпеня (у некаторых рэгіёнах — з 24 на 25 чэрвеня).

**Кажуць, што купальскай раніцай можна пабачыць неверагодную з'яву, калі сонца «іграе», пераліваецца рознымі колерамі. Той, хто заўважыць прыродны цуд, будзе жыць доўга і шчасліва.**



Абрады з травой, агнём і вадой праводзяцца менавіта ў самую кароткую Купальскую ноч. Дзень летняга сонцастаяння — галоўнае свята славян, час найвышэйшага развіцця жыццёвых сіл прыроды. Лічылася, што, выканаўшы сваю місію, бог Ярыла ў гэты час паміраe і адраджаецца ў выглядзе Купалы — бога лета, рознакаляровых кветак і спелых пладоў.

Гэта свята нашы продкі таксама называлі днём Івана Зёлкі: лекавыя расліны, сабраныя ў гэты час, валодаюць цудадзейнымі ўласцівасцямі. Таму і імкнуліся сабраць як мага больш духмянага чабору, святаянніку, падбелу, крываўніку, каб засцерагчы членаў сям'і і свойскую жывёлу ад хвароб на ўвесь год. А чароўныя пералёт-траву, цірліч-траву, архілін ды прамяністую кветку папараці, якая па паданнях прыносіць небывалае шчасце, марылі знайсці ведзьмы і чарадзеі. Архілін, па павер'ях, ратаваў ад падкопаў злых духаў, сок цірліча прываблівaў велізарнае багацце, а пералёт-трава дарыла шчасце таму, хто яе знайшоў.

Так, Купалле — гэта яшчэ і магчымасць сустрэчы з тагасветам, з якім жывуць чароўныя духі. Вабіла нашых продкаў сустрэча з разрыў-травой, для здабычы якой існаваў складаны цікавы рытуал: касілі ў Купальскую ноч траву на пустцы, пакуль не пераломвалася лязо касы. Дзе яно падала, мураву збіралі і кідалі ў раку; зеляніну, што плыла супраць плыні, называлі разрыў-травой.

Натуральна, не абыходзілася свята без варожбаў. Усім добра вядомы рытуал пляцення вянкоў і пускання іх па вадзе. Калі ў плыні ракі вянкі дзяўчыны і хлопца сустрэнуцца — быць ім разам. А вось на Жыткавіччыне прынята гуляць у іншую гульню: хлопцу трэба злавіць у паветры вянок, кінуты дзяўчынай. А для дзяўчат існавала дакладная прыкмета, звязаная з зёлкамі: у поўнач, заплюшчыўшы вочы, трэба было набраць кветак і пакласці пад падушку, а раніцай праверыць, ці набралася 12 розных траў. Калі так, то дзяўчына ў гэтым годзе магла чакаць жаніха.

Нашы продкі верылі, што ў купальскую ноч усё ажывае: дрэвы блукаюць па лесе, расліны шэпчуцца паміж сабой, жывёлы і птушкі размаўляюць. І людзі імкнуліся стаць адным цэлым з прыродай: спявалі пералівістыя песні падчас збору зёлак, дзякавалі за багаты ўраджай, добрае паляванне.

А як жа без скокаў праз вогнішча? Лічылася, што купальскі агонь валодае неймавернай ачышчальнай сілай, дапамагае пазбавіцца ад унутранага бруду, вылечвае ад хвароб, становіцца знакам абнаўлення жыцця. Ды і паваражыць можна: не дакранешся да агню, не паляцяць іскры — выйдзеш замуж ці здабудзеш поспех. А пара, якая скокне цераз агонь і не разарве рук, будзе жыць у згодзе і шчасці доўгія гады. Сам купальскі агонь лічыўся лекавым, таму пасля свята яго ўдзельнікі імкнуліся захапіць з сабой вугольчык з вогнішча і захоўвалі яго да наступнага года. Лічылася, што гэты знак абараняе хату ад пажараў, прыносіць здароўе і дабрабыт у сям'ю.

### Дзе ты, папараць-кветка?

Бадай, усім вядома, што галоўным «героем» Іванава дня з'яўляецца кветка папараці — Перунова кветка, як яе называлі продкі. Кажуць, што роўна ў поўнач усяго на некалькі імгненняў раскрываецца яе чароўнае вогненнае вока і таму, хто паспее яе сарваць, становіцца відаць любы клад, як бы глыбока ён ні знаходзіўся, і ўсе жаданні ўладальніка спраўджваюцца. Натуральна, нячыстай сіле не хочацца дзяліцца са звычайнымі людзьмі сваімі магічнымі ўласцівасцямі, таму і адводзяць злыя духі аматараў пошукаў кветкі, стараюцца заблытаць сцежкі, напалохаць і ўсяляк перашкодзіць у пошуках.

На Купалле праводзіцца шмат абрадаў, звязаных з вадой. Напрыклад, у ноч напярэдадні Івана Купалы дзяўчаты апускаюць на раку вянкі з запаленымі лучынкамі або свечкамі. Калі вянок тоне адразу, значыць, суджаны разлюбіў; чый вянок даўжэй праплыве, тая будзе шчаслівай, а ў каго лучынкі даўжэй пагараць — пражыве доўгае жыццё.

Ёсць і іншая інтэрпрэтацыя гэтай варажбы: вянкі з бярозы пускаюць у ваду і сочаць: чый патануў — тую напаткае смерць, паплыў — замуж прыгажуня выйдзе, а да берага прыб'е — так незамужняй ёй быць гэты год.

Нашы продкі верылі, што Купалле — гэта час абуджэння звышнатуральных сіл, не толькі добрых, але і злых. Ведзьмы ў гэтую ноч рабіліся больш небяспечныя, таму нашы прапрадзеды клалі на парозе і на падаконніках крапіву, а абараніцца сябе ад нападу, а таксама замыкалі коней, каб ведзьмы не выкралі і не паехалі на іх на Лысую гару. А на Палессі ёсць такое павер'е: напярэдадні Купалля тут чапляліі крапіву на вароты, каб вядзьмарка апякла рукі і не змагла трапіць у двор.

Свята доўжылася ўсю ноч — яна ж найкарацейшая. А калі займаўся світанак, моладзь плюхалася ў рэках, гойдалася ў ранішніх росах. Кажуць, што купальскай раніцай можна пабачыць неверагодную з'яву, калі сонца «іграе», пераліваецца рознымі колерамі. Той, хто заўважыць прыродны цуд, будзе жыць доўга і шчасліва.

### І будзем спяваці, і будзем плясаці!

*А дзе Купала начавала?*  
*Купала, ой, рана.*  
*Там на гародзе, пад лебядою,*  
*Там за пятою, пад лебядою.*

Даследчыкі спеўных традыцый беларусаў сцвярджаюць, што Купалле — свята экстравертнае, яго энергія скіраваная на суладдзе існавання чалавека і прыроды. Таму і для купальскіх спеваў характэрная неверагодная звонкасць, галаснасць. Пад такія песні зручна вадзіць карагоды, гуляць у вясёлыя гульні. Нярэдкія і жартоўныя матывы, такія песні спяваліся з мэтай пакпіць з хлопцаў, дзяцюкоў, прыдумаць смешную сітуацыю, у якую яны маглі б трапіць. Вось, напрыклад, такія прыпеўкі спяваюць на Жыткавіччыне:

*Сёння Купала, заўтра Ян,*  
*Ды будзе, хлопчыкі, ліха вам.*  
*Ды якое ж ліха ліхое —*  
*Пагоніце коней у поле.*



Далей у песні вядзецца гаворка пра тое, што ў працы, доглядзе жывёлы хлопцы знойдуць сабе і «падушку», і «жонку».

Ёсць і іншы варыянт такога жарту-спеву:

*Да сягоння Купала,*  
*заўтра — Іван,*  
*Будзе, дзецюкі, ліха вам.*  
*А якое ліха — ліхое,*  
*Пагоніце сабакі ў поле.*  
*Да ад свіньня лебядзіцы*  
*Пагоніце сабакі да вадзіцы.*

**Не дакранешся да агню, не паляцяць іскры — выйдзеш замуж ці здабудзеш поспех. А пара, якая скокне цераз агонь і не разарве рук, будзе жыць у згодзе і шчасці доўгія гады.**

Нярэдкія і песні мінорнага гучання. Яны расказваюць пра гісторыі стасункаў сімвалічнай дзяўчыны Купалкі, часам русалкі (па сутнасці, кожнай дзяўчыны ў вёсцы), пошуку свайго кахання і шчасця. Напрыклад, вось такая павольная песня з Палесся:

*Ой, рана на Купала,*  
*Ой, рана на Івана.*  
*Там русалка купалася*  
*Ой, рана, ой, рана.*  
*Купалася, умывалася.*  
*У вянок з цвяточкаў убралася.*  
*К свайму мілому прыбіралася.*

Ліпень тым і прывабны, што цеплынёй і ласкавым сонейкам атуляе ўсю прыроду і самога чалавека. Час ляціць хутка, праца змяняецца адпачынкам, песнямі ды танцамі ўвечары. Так неўпрыкмет набліжаецца вельмі адказны час, перыяд касавіцы, збору ягад і грыбоў, натуральна, жніва. Нездарма ж у народзе кажуць: «паспелі чарніцы — паспела і жыта». Ад таго, як папрацуеш улетку, як паклапоцішся пра запасы на зіму, будуць залежаць дабрабыт і здароўе сям'і. Таму сустрэнемся ў жніўні. Мы раскажам, чаму нашы продкі перад жнівом неслі на поле хлеб, соль і грамнічную свечку, чаму першы зажынкавы сноп на Палессі называюць «імяннінікам», а зерне з яго лічаць лекавым.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**  
*vesialuha@zviazda.by*

## Серада, 12 ліпеня

### Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**8.50** Слова мітрапаліта Паўла на дзень апосталаў Пятра і Паўла.
**9.10, 10.05, 22.00 Серыял «След». (16+).**
**10.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.00** Дзіцячы доктар (6+).
**11.35, 12.10, 19.55 Серыял «Лесвіца ў нябёсы». (12+).**
**13.05, 15.45 Серыял «Заказаныя жанчыны». (16+).**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25** Нашы (6+).
**16.45** «Выратуйце нашу сям'ю». (16+).
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.
**0.50 Серыял «Вышук». (16+).**

### Беларусь 2

**7.00** Тэлераніца (12+).
**9.00, 22.10** Тэлебарометр.
**9.05, 19.45 Меладрама «Жамчужына палаца». (12+).**
**10.20** «Пра ежу». Кулінарны майстар-клас (12+).
**10.50, 16.30 Серыял «Кухня». (16+).**
**12.00, 22.15** «Бітва экстрасэнсаў. 12-ы сезон». (16+).
**14.05, 21.00** «Паненка-сялянка». Рэаліці-шоу. (16+).
**15.20** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект.
**16.05** «Багіня шопінгу». Фэшн-шоу. (16+).
**17.30** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу. (16+).
**22.05** Спортлато 5 з 36, КЕНО.
**0.15** «Анлайн 2.0». Скетчкам. (16+).

### Беларусь 3

**7.00, 12.45** «Я хачу гэта ўбачыць!» Орша (6+).
**7.25** «Беларуская кухня». Халадзец з рыбы.
**7.55, 12.00, 18.40** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.10, 12.15, 18.55, 23.45** «Гэты дзень».
**8.15 «Тры талеры». Серыял. (6+).**
**9.05** М/ф (0+).
**9.25, 14.15 «Памяць сэрца». Драма. (12+).**
**11.00, 15.50 «Чатыры танкісты і сабака». Маст. фільм. (12+).**
**13.05** «Гуляй, душа!» Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята».
**16.50, 21.05** «Курская бітва. Час перамагаць». «Танкавая бітва веку» (12+).
**17.30, 21.45 «Атрад спецыяльнага прызначэння». Драма. (12+).**
**19.00** «Славянскі базар — 2017». XV Міжнародны дзіцячы музычны конкурс «Віцебск». Дзень першы.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.55 «Так склаліся зоркі». Драма. (16+).**

### Беларусь 5

**8.00** Час футбола.
**8.45** Тэніс. Уімблдон. 1/4 фіналу. Жанчыны.
**12.05** Спорт-кадр.
**12.35** Футбол. Кубак канфедэрацый. Фінал. Чылі — Германія.
**14.40** Козел пра футбол.
**15.00, 22.40** Тэніс. Уімблдон. 1/4 фіналу. Мужчыны.
**20.05** Змяшаныя адзінаборствы. UFC.
**22.30** Спорт-цэнтр.

### АНТ

**6.00, 6.30, 7.00** (з субцітрамі), **7.30, 8.00** (з субцітрамі), **8.30, 9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!» (12+).
**10.20** «Смак» (12+).
**11.05, 13.05, 16.15, 18.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Модны прыгавор» (12+).
**12.10** «Сам-насам з усімі» (16+).
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**14.15, 16.20** «Час пакажа» (16+).
**16.55** «Давай пажэнімся!» (16+).
**18.20** «Кантрольная закупка» (12+).
**18.55** «Удача ў прыдачу!» Дзённік (12+).
**19.00** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Чырвоныя горы» (16+).**
**23.00 Серыял «Лонданград» (16+).**
**23.55** «Гонка на выміранне» (16+).
**0.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.25** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**7.40, 20.10, 23.00** «СТБ-спорт».
**8.30, 23.05** «Тайны Чапман» (16+).
**9.20** «Далёкія сваякі» (16+).
**9.35, 17.35** «Званая вячэра» (16+).
**10.40, 18.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**11.30, 22.00** «Глядзець усім!» (16+).
**11.50, 23.55 «Баец». Серыял (16+).**
**13.50** «Тэрыторыя памылак» (16+).
**15.35** «Вадзіць па-руску» (16+).
**16.05** «Аўтапанарама» (12+).
**16.50 «Салдаты і афіцэры». Серыял (16+).**
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**1.30** «Месяцавая гонка». (16+).

### МІР

**6.00** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.00** Добрай раніцы, свет! (16+).
**8.35** «Няма праблем» (16+).
**10.00** М/ф (0+).
**10.10** «Цяжар абеду» (12+).
**10.40** «Любімыя акцёры», Ніна Усатава (12+).
**11.10, 13.15, 0.55 Серыял «Я прыйду сама». (16+).**
**13.00, 16.00, 19.00** Навіны (бягучы радок).
**15.00** Дак. фільм «Сямейныя драмы» (16+).
**16.15, 17.10, 18.05 Серыял «Вяртанне Мухтара-2». (16+).**
**19.20, 4.05 Серыял «Закон і парадак». (16+).**
**23.10 Маст. фільм «Фота на дакументы» (12+).**

### РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Простыя пытанні» з Ягорам Хрусталёвым.
**12.00** «60 хвілін». Ток-шоу.
**13.20** «Пакой смеху» (16+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.35** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**15.40** «Прамы эфір» (16+).
**17.20 Серыял «Пыльная работа» (16+).**
**19.15, 20.40 Серыял «Тэрмінова ў нумар!» (16+).**
**22.00, 23.10 Серыял «Вясковы раман» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**5.55** «Астрапрагноз».
**6.00, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**6.10** Кватэрнае пытанне (0+).
**7.10** «Дзелавая раніца НТБ» (12+).
**8.05 Серыял «Вісякі» (16+).**
**8.55, 23.10** «НЗ.by».
**9.10, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара» (16+).**
**11.20 Серыял «Кодэкс гонару» (16+).**
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.05 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**16.35 Серыял «Сведкі» (16+).**
**19.40 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч» (16+).**
**23.30 Серыял «Дазнаўца» (16+).**

### 8 канал

**7.00, 15.50, 19.00, 21.00, 23.55** «Надвор'е».
**7.05** «Мультпарад».
**7.35 Серыял «Выратаваць боса».**
**8.25 Серыял «Прынц і я».**
**10.15** «Сябры дзядулі Марка».
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Манія Жызелі».**
**12.40, 19.10 Серыял «Падземка».**
**14.10 Драма «Харысты».**



**15.55** «Мультпарад»: «Тайна Сухаравай вежы».
**16.10 Камедыя «Чумавая пятніца».**
**17.45 Серыял «Паміж намі кажучы».**
**18.30** «Мой любімы гадаванец».
**20.50** «Вечарніца».
**21.05 Драма «Дар».**
**23.00 Серыял «Тыран».**

### ВТБ

**6.00, 14.10** Серыял «Варонiны». (12+).
**8.00, 4.20** «Ералаш». (6+)
**8.30, 3.20** М/ф «Тры каты». (0+)
**8.50, 3.40** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.10, 4.00** М/ф «Маша і мядзведзь». (0+)
**9.30, 19.00** Серыял «Дах свету-2». (16+).
**10.30** Баявік «Прафесіянал». (12+).
**12.50, 2.15** «Дурні і дарогі». (16+).
**13.10, 20.00** Серыял «Вечны водпуск». (16+).
**16.20** Серыял «Закрытая школа-3». (16+).
**17.20, 0.50** Серыял «Васьмідзясятыя-6». (16+).
**17.50, 23.00** «Уральскія пельмені». (16+).
**21.00** Баявік «Без кампрамісаў». (16+).
**0.00** Серыял «Карабель». (12+).
**1.15** «Лаві момант». (16+).
**1.35** Серыял «Бязмоўны сведка». (16+).
**2.35** «Не можа быць!» (16+).
**5.10** Серыял «Метад Лаўровай». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.30, 23.20** Навіны культуры.
**10.15, 1.55** «Назіральнік».
**11.15, 22.05** «Каломба». Серыял.
**12.30** «Нябачны Крэмль». Дак. фільм.
**13.10** «Яўген Тарле. Навука выжываць». Дак. фільм.
**13.55** «Рахманінаў. Усяночнае няспанне».
**15.10** «Разам з Хорам». Дак. серыял.
**15.40, 20.50** «Ключ да разгадкі старажытных скарбаў». Дак. серыял.
**16.25** «Правінцыяльныя музеі Расіі». Музей-запаведнік «Дзіўнагор'е».
**16.55, 0.05** «Вечны кліч». Серыял.
**18.10** «Пётр Вельямінаў. Людзі. Ролі. Жыццё». Дак. фільм.
**18.40** «Ёган Вольфганг Гётэ». Дак. фільм.
**18.45** «Жыццё робіць лепш, чым ты задумаў...»
**19.15** «Добрай ночы, малыя!»
**19.45** Штучны адбор.
**20.25, 1.10** «Касмічная адысея. XXI стагоддзе». Дак. серыял.
**21.40** Да 85-годдзя з дня нараджэння Пятра Фаменкі. «Тэатральны летапіс».
**23.35** «Бабін век». Дак. серыял.
**1.40** Сусветныя скарбы.

### Настальгія

**6.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Бітлз». 2005 год (18+).
**7.00, 8.50, 9.40, 11.00, 14.35, 15.40, 17.00, 18.45, 20.05, 21.40, 23.00, 2.00, 5.15** Музычная настальгія (12+).
**7.15** Фільм-спектакль «Прачніся і спявай!» 1974 год (16+).
**9.00, 15.00, 21.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.30** «Сядзі і глядзі». Музычна-парадыйная праграма (16+).
**12.00** «Спяем, сябры!» з Тацянай Візбар. 2008 год (12+).
**13.00** Тэлеспектакль «Гульцы». 1978 год (16+).
**18.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Грушынскі фестываль. Падрабязнасці». 2007 год (12+).
**19.00** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Аб густах не спрачаюцца». 1982 год (16+).
**20.20** Дак. фільм «Зоркі Савецкага спорту». (12+).
**0.00** «Зямля—Паветра». «Начныя снайперы». 2002 год (16+).
**1.20** Праграма «Тэма» з У. Лісцьевым «Легалізацыя, нашэнне і захоўванне зброі». 1992 год (18+).
**2.15** Канцэрт гурта «Машина времени». 1990 год (12+).
**3.00** Маст. фільм «Начныя забавы». (16+).

### EuroSport 1

**4.00, 11.15** Лёгкая атлетыка. EAA Meetings.
**5.30, 9.35, 14.00, 2.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**7.00, 19.15, 23.00, 1.30** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-19).
**8.00** Супербайк. Этап чэмпіянату свету.
**12.45, 22.00, 0.35** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**13.45, 18.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**21.30** Футбол. «ФІФА».

### Кінакамедыя

**0.30** Камедыя «Ні хвіліны спакою». (12+).
**2.00** Камедыя «Хочаш ці не?» (16+).
**3.40** Камедыя «Сутэнёр». (16+).
**5.25** Камедыя «Рассеяны». (0+).
**6.55** Прыгоды «Адзін шанц на дваіх». (16+).
**8.50** Камедыя «Галоўнае — не баяцца». (16+).
**10.45** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе». (16+).
**12.20** Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта». (16+).
**14.00, 14.50, 15.40** Скетчкам «Паміж намі». (16+).
**14.20, 15.10** «Камедыянты (Шоу)» (Выпуск 23). (16+).
**16.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-2». (16+).
**17.45** Камедыя «Нянькі». (16+).
**19.30** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3». (16+).
**21.00** Камедыя «Каманда мары». (16+).
**22.45** Камедыя «Якія спяваюць заўтра». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.35** «Шафа» (16+).
**8.25** «Доктар І...» (16+).
**8.55, 19.00, 3.15** «Падарунак лёсу». Серыял. (16+).
**10.30** «Судовыя страсці». Дак. серыял (16+).
**12.10** «Сляпая» (12+).
**13.10** «Варажбітка» (12+).
**14.15, 4.40** «Паралельны свет» (12+).
**15.10** «Трэндзі» (16+).
**15.40** «Здзелка» (16+).
**16.15** «Натуральны адбор» (12+).
**17.10** «Адкрыта» (12+).
**18.05** «Самара». Серыял. (16+).
**20.40** «Магазіна» (16+).
**21.40** «Рэвізора» (16+).
**23.05, 5.30** «Лінія абароны» (16+).
**23.35** «Звышнатуральнае». Серыял. (16+).
**0.20** «Моцны арэшак». Баявік. (16+).
**2.25** «Жанна, пажані» (16+).

### ТБ1000

**6.10, 18.35** Ужо хто б гаварыў-2 (12+).
**7.45** Дракула (16+).
**10.10** Дзень сурка (12+).
**12.10** У чаканні вечнасці (16+).
**14.05** Не ў сабе (16+).
**16.20** Ціхая гавань (12+).
**20.10** Каралеўства поўнага месяца (12+).
**22.05** Елізавета (16+).
**0.30** Секс па дружбе (16+).
**2.40** Робін Гуд: мужчыны ў трыко. (12+).
**4.25** Гэта вельмі пацешная гісторыя (16+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Няўлоўныя: апошні герой (16+).
**8.10** Службовы раман. Наш час (16+).
**10.15** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**12.20** Старое добрае кіно. Не бойся, я з табой! 2-я частка (12+).
**14.10** Два дні (16+).
**16.10** Кухня ў Парыжы (12+).
**18.15** Кандагар (16+).
**20.20** Пятніца (16+).
**22.20** Іншае кіно. Якія блукаюць (12+).
**0.20** Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).
**2.20** Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі (16+).
**4.25** На кручку! (16+).

### National Geographic

**6.00** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**6.45, 14.10, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**8.00, 10.20, 14.55** Мегазаводы. (12+).
**8.50, 11.05, 15.40** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.35, 13.25** Гульні розуму. (12+).
**11.50, 16.25, 19.30, 0.10, 2.25** Расследаванні авіякатастроф. (12+).
**12.35, 18.45, 21.45, 1.40, 4.45** Пачатак. (12+).
**17.10, 23.20, 3.10** Секунды да катастрофы. (16+).
**18.00, 21.00, 0.55, 4.00** Дзікі тунец. (12+).
**20.15** Аўта-SOS. (12+).
**22.35** Ліхтугі за мяжой. (16+).

### Discovery

**8.00, 14.00, 0.00, 3.50** Зорнае выжыванне. (16+).
**9.00, 15.30, 21.30, 5.55** Як гэта ўстроена? (12+).
**9.30, 15.00, 21.00, 5.30** Як гэта зроблена? (12+).
**10.00, 16.00, 23.00, 7.10** Паляўнічыя на рэліквіі. (12+).
**10.30, 16.30, 19.00, 23.30, 2.00, 7.35** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00, 13.30** Ліквідатар. (16+).
**17.00, 22.00, 6.20** Махінатары. (12+).
**18.00, 1.00** Бітва з акіянам. (12+).
**20.00** Скарб Купера. (12+).
**2.55** Як працуюць машыны. (12+).
**4.40** Маланкавыя катастрофы. (16+).

## Усходні гараскоп на



**АВЕН.** Вы амаль усё абдумалі, і пачатак тыдня — добры час, каб прыняць канчатковае рашэнне. Спатрэбіцца дыпламатычнасць і ўраўнаважанасць. Памятайце, паспешлівасць у гэтым выпадку можа нашкодзіць. Паспрабуйце не трапіць на вуду зайздроснікаў. Уважліва сачыце за сваімі словамі. Не забывайце пра дом і сям'ю, пажадана больш часу прысвяціць навядзенню парадку, пазбаўцеся ад непатрэбнага хламу і старых рэчаў. У суботу, вырашаючы пытанне з набыткамі, парайцеся з блізкімі людзьмі. У нядзелю не адмаўляйцеся ад запрашэння на пікнік, вы выдатна правядзяце час.



**ЦЯЛЕЦ.** Тыдзень спрыяльны для добрасумленнай працы. Вам будзе проста неабходна мабілізаваць свае сілы для рашучага прарыву, інакш поспеху не дамагчыся. Але не варта забываць і пра адпачынак. Паспрабуйце прагуляцца перад сном, у выхадныя арганізуйце невялікае, але эфектнае свята для сваіх сяброў, яны будуць вельмі ўдзячныя.



**БЛІЗНЯТЫ.** На гэтым тыдні нельга сядзець склаўшы рукі, вас чакаюць цікавыя праекты і творчая праца. Не ідзіце на ахвяры, абараняйце свае інтарэсы, гэта павысіць ваш аўтарытэт. У пятніцу будзьце гатовыя да прыёму гасцей. У выхадныя адпачніце на прыродзе. Праўдзівасць і шчырасць нядзельным днём могуць тварыць цуды. Гэты дзень схіляе да даверлівых зносін. Праявіце максімум увагі да блізкіх людзей.



**РАК.** Не выключана, што на гэтым тыдні ваша актыўнасць будзе некалькі абмежаваная аб'ектыўнымі прычынамі. Не плывіце супраць плыні, заставайцеся часова на другіх ролях. Менавіта гэтая тактыка прывядзе да найлепшага выніку. У чацвер парадуе каханы чалавек. У суботу будзьце асцярожныя, правярайце інфармацыю. Нядзеля можа стаць удалым днём для планавання важных спраў і наладжвання кантактаў.



**ЛЕЎ.** Надышоў час для нарошчвання актыўнасці, не лянуйцеся, не бойцеся перамен. Па магчымасці будзьце ўважлівыя і асцярожныя. На гэтым тыдні вам удасца наладзіць дзелавыя сувязі. Бліжэй да выхадных задумайцеся пра адпачынак, калі ён яшчэ не пачынаўся. Цікавае, займальнае падарожжа або круіз падарылі б вам незабыўныя ўражанні.



**ДЗЕВА.** Могуць ускладніцца адносіны на рабоце. Магчыма, давядзецца шукаць кампраміс паміж сямейнымі і прафесійнымі абавязкамі. Для зносін у калектыве вам спатрэбяцца такія якасці, як тактоўнасць і ўменне спачуваць. У сераду абстаноўка на рабоце стане больш творчай і канструктыўнай. Перад вамі могуць адкрыцца цікавыя перспектывы і новыя гарызонты. У пятніцу пажадана не ўвязвацца ў сумніўныя і авантурныя гісторыі: вас можа чакаць толькі расчараванне.

## Субота, 15 ліпеня

### Беларусь 1

**6.15** Існасць.
**6.40 Меладрама «Страшная прыгажуня». (12+).**
**8.25** Кулінарная дыпламатыя (12+).
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** Здароўе (12+).
**10.00** Дача (12+).
**10.30** Вялікі сэлфі-тур (12+).
**11.05** 50 рэцэптаў першага (12+).
**12.10 Серыял «Байкі Міцяя». (12+).**
**13.15, 15.45 Меладрама «Адзіны і назаўсёды». (16+).**
**15.15** Краіна.
**17.25 Меладрама «Памяць сэрца». (16+).**
**21.00** Панарама.
**22.00** XXVI Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2017». Фінал. Дзень першы «Славянскі хіт».
**0.00 Камедыя «Дзень выбараў». (16+).**
**2.05** Дзень спорту.

### Беларусь 2

**7.05** М/с «Сябры анёлаў». (6+).
**7.35 Фільм для дзяцей «Залатавалоска». (6+).**
**8.35, 22.05** Тэлебарометр.
**8.40** «Свет навыварат». Трэвел-шоу. (16+).
**9.35 Серыял «Шчаслівыя разам-5». (16+).**
**10.40, 20.20** «Тата папаў». Сямейнае рэаліці-шоу. (16+).
**13.00** «Вяселле без баяна» (12+).
**13.35** «Моду народу». (12+).
**14.25** Анімацыйны фільм «Лясная братва». (12+).
**15.50** «Капейка ў капейку» (12+).
**16.25** «Вяселле ўсляпую». Рэаліці-шоу. (16+).
**17.40 Камедыя «Знаёмства з бацькамі». (16+).**
**19.35** «Рэпарцёр» (16+).
**22.00** Спортлата 6 з 49, КЕНО.
**22.10** «Вярніце мне прыгажосць». Медыцынскае рэаліці. (16+).
**23.20 Фантастыка «Зорныя войны: эпізод II — атака клонаў». (12+).**

### Беларусь 3

**7.35** «Сіла веры».
**8.00, 12.25, 18.40** «Калейдаскоп». Навіны культуры.
**8.15, 18.55, 23.35** «Гэты дзень».
**8.20** «Беларуская кухня». Ножкі ў фасолі. Яблычны дэсерт.
**8.50 «Звычайны цуд». Мюзікл. (12+).**
**11.10** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**11.35** «Навукаманія» (6+).
**12.00** М/ф (0+).
**12.40 «Жандар жэніцца». Камедыя. (12+).**
**14.10** «Камертон». Народны артыст СССР Валянцін Елізар'еў.
**14.40** Арам Хачатуран. «Спартак». Балет Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета. Харэаграфія і пастаноўка Валянціна Елізар'ева.
**16.20 «У двух кроках ад «Раю». Драма. (12+).**
**17.45** «Майстры і куміры». Паэтэса, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Валянціна Паліканіна.
**19.00** «Славянскі базар — 2017». XXVI Міжнародны конкурс выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск». Паўфінал.
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Серыял. «Сабака Баскервіляў». (12+).**

### Беларусь 5

**7.50** Лёгкая атлетыка. Міжнародная серыя. Мадрыд.
**9.55** Веславанне на байдарках і каноэ. Чэмпіянат Еўропы.
**12.40, 18.35** Лёгкая атлетыка. Маладзёжны Чэмпіянат Еўропы (U23). Водныя віды спорту. Чэмпіянат свету.
**16.00** Тэніс. Уімблдон. Фінал. Жанчыны.
**22.10** Спорт-цэнтр.
**22.20** Піт-стоп.
**22.55** Аўтаспорт. Формула-Е. Нью-Ёрк.

### АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**7.05 Серыял «Лонданград» (16+).**
**9.05** М/с «Смяшарыкі. Новыя прыгоды» (0+).
**9.20** «Здароўе» (16+).
**10.30** «Смак» (12+).
**11.10** «Ідэальны рамонт» (12+).
**12.10** «Рыгор Лепс. Па нахіленай уверх» (12+).
**13.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраоптам» (12+).
**14.25** «Вакол смеху» (12+).
**16.15** (з субцітрамі), **21.00** Навіны спорту.
**16.20** «Ералаш» (6+).
**16.45** «Хто хоча стаць мільянерам?» (12+).
**17.50** «Кропля ў кроплю» (16+).
**21.05** «Сёння ўвечары» (16+).
**22.35** «МаксімМаксім» (16+).
**23.40 Маст. фільм «Не хапала клопату» (12+).**

### СТБ

**6.05 «Салдаты і афіцэры». Серыял. (16+).**
**7.45** «Тайны Чапман» (16+).
**8.35** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**9.30** «Рамонт па-сумленнаму» (16+).
**10.05** «Самая карысная праграма» (16+).
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.35** «Свет на лічыльніку: калі новы крызіс?» (16+).
**13.10** «Усім па катку» (16+).
**13.30, 16.30, 19.30** «24 гадзіны».
**13.40** «Адкрытая размова».
**13.40, 1.05 Камедыя «Вяселле ў Малінаўцы». (6+).**
**15.20** «Далёкія сваякі» (16+).
**15.55** «Вялікі горад».
**16.40** Канцэрт Міхаіла Задорнава.
**17.35 «Ціхі цэнтр». Серыял. 1-я і 2-я серыі (12+).**
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Засакрэчаныя спісы. Бітва за Зямлю! Новыя сведчанні аб НЛА». (16+).
**21.50 «Белыя ваўкі-2». Серыял (16+).**

### МІР

**6.00, 8.20** М/ф «Маша і Мядзведзь» (0+).
**7.50** «Саюзнікі» (12+).
**9.00** «Вой, мамачкі!» (12+).
**9.30** «Любімыя акцёры», Міхаіл Баярскі (12+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.10** «Здабытак рэспублікі» (12+).
**10.40 Маст. фільм «Д'Артаньян і тры мушкецёры», 1—3-я серыі (0+).**
**15.30** «Цяжар абеду» (12+).
**16.15 Серыял «Маша ў законе-2». (16+).**
**23.20 Серыял «Мафіёза». (16+).**
**2.20** Дзённік «Славянскага базару».
**2.30** XXVI Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар» у Віцебску. Саюзная дзяржава запрашае.
**4.00** М/ф (0+).

### РТР—Беларусь

**7.00** «Пакой смеху» (16+).
**7.35 Серыял «Сямейны дэтэктыў» (12+).**
**11.00, 14.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Жывыя гісторыі» (12+).
**12.20** «Пяцёра на аднаго» (12+).
**13.10** «Наша справа» (16+).
**13.25** «Пакой смеху» (16+).
**14.30, 20.45 Серыял «Кропка кіпення». (12+).**
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**22.35 Маст. фільм «Жыццё рассудзіць» (12+).**

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05** «Ты супер!» (6+).
**8.00, 10.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.20** «Урачэбныя тайны плюс» (12+).
**8.55** «Прыгажосць па-руску» (12+).
**9.40** «НЗ.by».
**10.20** «Галоўная дарога». (16+).
**11.00** «Ежа жывая і мёртвая» (12+).
**12.00** «Кватэрнае пытанне». (0+).
**13.00** «Паедзем, паядзім!» (0+).
**13.20** «Удача ў прыдачу!»
**14.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў» (16+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+).
**17.15** «Сакрэт на мільён». Барыс Маісееў (16+).
**19.25** «Ты не паверыш!» (16+).
**20.00 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**23.10** «Экстрасэнсы супраць дэтэктываў» (16+).

### 8 канал

**9.00, 15.55, 19.00, 21.15, 23.55** «Надвор'е».
**9.05** «Сябры дзядулі Маркa».
**9.30** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**9.45 «Сінематограф». Маст. фільм «Перакрыжаванне кахання і шпагі».**
**10.05 Мюзікл «Прынцэса цырка».**
**12.35 Камедыя «Леў Гурыч Сінічкін».**
**14.10** Глядзім ўсёй сям'ёй. М/ф «Звярыны свет».
**16.00** «Адшукваецца адпачынак».
**16.30 Серыял «Эксперт».**
**17.25, 19.05 Серыял «Агнём і мячом», 1—4-я серыі.**
**20.50** «Вечарніца».
**21.00** «Фэшн is my прафэшн».
**21.20 Драма «Чорны ястраб».**

### ВТБ

**6.00** «Турбаміксер». (16+).
**6.30** Скетч-шоу «6 кадраў». (16+).
**7.30** Скетч-шоу «Асцярожна: дзеці!» (6+).
**8.30** М/ф «Егіптус». (0+)
**9.00, 3.10** М/ф «Тры каты». (0+)
**9.20, 3.20** М/ф «Фіксікі». (0+)
**9.40, 3.40** М/ф «Маша і мядзведзь». (0+)
**10.00, 2.30** «Ералаш». (6+)
**11.20** Анімацыйны фільм «Альфа і Амега: ікластая братва». (12+).
**13.00** Серыял «Вы ўсе мяне прыводзіце ў шаленства». (16+).
**15.00, 19.20** «Уральскія пельмені». (16+).
**16.40** Камедыя «Крывей і потам: анаболікі». (16+).
**21.00** Трылер «Экіпаж». (16+).
**23.40** Фэнтэзі «Іншы мір-2: эвалюцыя». (16+).
**1.35** «Імперыя ілюзій: браты Сафронавы». (16+).
**4.00** «Лаві момант». (16+).
**5.00** «Дурні і дарогі». (16+).

### Культура

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00** Біблейскі сюжэт.
**10.35, 0.30** «Да Чорнага мора». Маст. фільм.
**11.45** «Яўген Самойлаў». Дак. фільм.
**12.30** «Аркестр будучыні». Растоў-на-Доне.
**13.10, 1.55** «Некранутая прырода Бразіліі». Дак. серыял.
**14.05** «Перадзвінкі. Ілья Рэпін». Дак. фільм.
**14.30** Ілюзіён. «Дзеці Райка». Маст. фільм.
**17.35** «Хто там...»
**18.05** Да юбілею Юрыя Станянава. Творчы вечар у Доме акцёра.
**19.05** «Бяссонная ноч». Маст. фільм.
**20.35** «Рамантыка рамanса». Юлій Кім і яго гісторыі.
**21.30** «Лінія жыцця». Вікторыя Ісакава.
**22.25** «Тры суперзоркі ў Берліне. Ганна Нятрэбка, Пласіда Дамінга, Раланда Вілазон».
**1.45** «Свята». М/ф для дарослых.
**2.50** «Рафаэль». Дак. фільм.

### Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Прыгоды Пятрова і Васечкіна». (16+).
**8.15** «Рок-урок». 1993 год (16+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**9.40, 11.40, 15.40, 18.00, 20.20, 23.05, 0.40, 2.05, 3.40, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**11.00** «Песня-82». 3-я частка (12+).
**12.00, 18.15** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1956. 2008 год (16+).
**13.15** «Кінапанарама». «Ганна Маньяні». 1983 год. 1-я частка (16+).
**14.00** Тэлеспектакль «Па старонках «Сатирикона». 1976 год (16+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**17.00** «Трыбунал». Канцэрт Наталлі Мядзведзевай. 1995 год (18+).
**19.25** Дак. фільм «Дысідэнты». (16+).
**20.40** Маст. фільм «Субота і нядзеля...» (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.00** Маст. фільм «Дробязі жыцця». (16+).
**23.30** Серыял «33 квадратныя метры. Дачныя гісторыі». (16+).
**0.00** «Быў час» з Аляксандрам Паліткоўскім: «Грушынскі фестываль. Падрабязнасці». 2007 год (12+).
**1.00** Праграма «Вясёлыя рабяты». «Аб густах не спрачаюцца». 1982 год (12+).
**2.20** Дак. фільм «Зоркі савецкага спорту». (12+).

### EuroSport 1

**4.00, 8.00** Лёгкая атлетыка. Юнацкі чэмпіянат свету.
**5.30, 13.00, 22.00, 0.35** Веласпорт. «Тур дэ Франс» з Грэгам Лемондам.
**6.30, 11.00** Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы (U-23).
**9.30, 14.15, 2.30** Веласпорт. «Тур дэ Франс».
**12.00** Скачкі з трампліна. Летні Гран-пры.
**14.00, 18.45** Веласпорт. «Тур дэ Франс»-экстра.
**19.00, 1.30** Футбол. Юнацкі чэмпіянат Еўропы (U-19). Фінал.
**21.30** Футбол. «ФІФА».
**23.00** Конны спорт. Global Champions Tour.

### Кінакамедыя

**0.25** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе». (16+).
**2.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-2». (16+).
**3.40** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе-3». (16+).
**5.10** Камедыя «Супермозг». (16+).
**7.15** Камедыя «Сутэнёр». (16+).
**8.55** Меладрама «Законы прывабнасці». (16+).
**10.35** Камедыя «Канікулы мары». (12+).
**12.15** Камедыя «Якія спяваюць заўтра». (16+).
**14.00** «Камедыянты (Шоу)». (16+).
**14.25** Камедыя «Оскар». (12+).
**16.00** Меладрама «Мая вялікая іспанская сям'я». (16+).
**17.45** Камедыя «SuperАлібі». (16+).
**19.20** Меладрама «Спачатку каханне, потым вяселле». (16+).
**21.00** Камедыя «Дублёр». (16+).
**22.35** Камедыя «Я не ведаю, як яна робіць гэта». (16+).

### ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**10.00** «Усё па фэн-шую» (12+).
**11.00** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.50, 2.30** «Суфлёр». Серыял. (12+).
**15.10** «Салодкая жанчына». Драма. (16+).
**16.50** «Жанна, пажані» (16+).
**17.50** «Вяселле і развод» (16+).
**18.40, 5.30** «10 самых» (16+).
**19.15, 1.40** «Блокбастары» (16+).
**20.15** «Любімая дачка таты Карла». Драма. (16+).
**22.10** «Гульня». Дэтэктыў. (16+).
**0.20** «Звышнатуральнае». Серыял. (16+).

### ТБ1000

**6.10** Двое ў Сусвеце (16+).
**8.40** Вельмі дрэнная настаўніца (18+).
**10.45** Ілюзіяніст (16+).
**13.10** Дракула (16+).
**15.45** Дзень сурка (12+).
**18.00** У чаканні вечнасці (16+).
**20.10** Ужо хто б гаварыў-3 (12+).
**22.05** Помні (Memento) (18+).
**0.20** Дварэцкі (16+).
**2.40** Секс па дружбе (16+).
**4.30** Каралеўства поўнага месяца (12+).

### ТБ1000 Рускае кіно

**6.20** Каралёў (12+).
**8.40** На мора! (16+).
**10.45** Адарванне (16+).
**12.35** Вясковы дэтэктыў (12+).
**14.35** Няўлоўныя: апошні герой (16+).
**16.15** Пра што гавораць мужчыны (16+).
**18.15** Службовы раман. Наш час (16+).
**20.20** Уладар сноў (16+).
**22.10** Ваўкадаў (16+).
**0.50** Прыстойныя людзі (16+).
**2.40** Якія блукаюць (12+).
**4.30** Пра што яшчэ гавораць мужчыны (16+).

### National Geographic

**6.00** Чалавек супраць YouTube. (12+).
**6.45, 5.35** Навуковыя недарэчнасці. (12+).
**7.35** Міжнародны аэрапорт Дубай. (12+).
**9.55** Сапраўдны суперкар. (12+).
**11.25, 21.40** Гісторыя Бога з Морганам Фрыменам. (12+).
**12.15** Прарыў. (12+).
**13.05, 3.10** Другая сусветная вайна: пекла пад вадой. (16+).
**15.20** Навука будучыні. (12+).
**16.05** Выратаваць планету. (12+).
**17.45, 20.50** Пачатак. (12+).
**18.30** Эвакуацыя Зямлі. (16+).
**19.15** Марс. (12+).
**22.30** Секунды да катастрофы. (18+).
**23.20** Даследчык. (18+).
**0.05** Ліхтугі за мяжой. (16+).
**0.50** Аэрапорт Кенэдзі. (16+).
**1.35** Зладзіць кантрабандыста. (18+).
**2.25** Дзіўная Другая сусветная. (16+).

### Discovery

**8.00** Бітвы робатаў. (12+).
**9.00** Бітва з акіянам. (12+).
**10.00** Паляўнічыя на склады. (16+).
**11.00, 23.00** Як працуюць машыны. (12+).
**12.00** Голыя і напалоханыя. (16+).
**13.00, 1.00** Аляска: сям'я з лесу. (16+).
**14.00, 22.00** Аперацыя «Выратаванне дома». (16+).
**15.00** Будаўнікі караблёў-гігантаў. (16+).
**16.00** Забытая інжынерыя. (16+).
**17.00** Скарб Купера. (12+).
**18.00, 7.10** Вялікі махінатар. (12+).
**19.00, 0.00** Хуткія і гучныя. (16+).
**20.00** Вулічныя гонкі. (16+).
**21.00** Смяротны ўлоў. (16+).
**2.00** Выжыванне без купюр. (16+).
**4.40** Мяцежныя гараж. (16+).

---

## У свеце жывёл

## Некультурны абмен на Балі

**Турыстам, якія жадаюць наведаць на востраве Балі індуісцкі храм Улувату, мясцовыя гіды рэкамендуюць быць асабліва асцярожнымі і пільна сачыць за сваімі рэчамі, грашыма, а таксама фотаапаратамі. І справа зусім не ў тым, што джунглі поўныя кішэннікамі — не, мясцовая «злачынная групоўка» складаецца з макак, якія навучыліся красці ў людзей рэчы і нават рабаваць білетныя касы, а вяртаць украдзенае толькі ў абмен на ежу.**



Міжнародны калектыў навукоўцаў з Бельгіі і Канады зацікавіўся незвычайнай малпінай мафіяй і на працягу доўгага часу назіраў за макакамі, вывучаючы, як нехарактэрныя для прыматаў мадэлі паводзін замацоўваюцца ў папуляцыі. Вынікі даследавання заолагі апублікавалі ў часопісе Primates. Так, у прыватнасці, высветлілася, што макакі перадаюць свае злачынныя навыкі з пакалення ў пакаленне, навучаючы рабаваць і шантажыраваць людзей. Больш за тое, на «павышэнне злачыннай кваліфікацыі» ў чароды, якія жывуць побач з храмам, рэгулярна прыбываюць дарослыя малпы з іншых зграй. Чым больш чаcу група макак праводзіць побач з людзьмі, тым больш прыматы схільныя зарабляць рэкетам. Часцей за ўсё крадуць акуляры, галаўныя ўборы і абутак. Самцы, як высветлілі навукоўцы, ідуць на рабаванне часцей, чым самкі.

Пры гэтым храмавыя малпы на Балі не галадаюць: турысты пастаянна падкормліваюць іх. Відавочна, звычка адбіраць у людзей каштоўныя рэчы і выменьваць іх на ежу сфарміравалася падчас доўгага ўзаемадзеяння бакоў. Між іншым, транзакцыі не заўсёды завяршаюцца для людзей удала: часам турысты застаюцца без сваіх рэчаў нават пасля ўручэння малпам «выкупу».

## Асцярожна, панда брэша!

**Турыстам у Сочы прапаноўвалі фатаграфавацца са шчанюком пароды чау-чау, якога выдавалі за дзіцяня панды, паведамляе ТАСС.**



Сочынская прыродаахоўная пракуратура прыйшла да такой высновы пасля праведзенай праверкі. Высветлілася, што сабаку перафарбавалі пад панду, каб увесці адпачывальнікаў у зман. Супрацоўнікі нагляднага ведамства таксама выявілі ў сочынскіх фатографаў малпу і асла. Пракуратура мае намер давецаца, ці ёсць ва ўладальнікаў дакументы на жывёл, а таксама высветліць, ці не абыходзіліся яны жорстка са сваімі гадаванцамі. Інфармацыя пра людзей, якія рабілі сумесныя здымкі ўсіх ахвотных з пандай, а таксама яшчэ з некалькімі звярамі, была апублікавана ў супольнасці «УКантакце» «Тыповы Сочы». Турыстам прапаноўвалі такую паслугу на назіральнай пляцоўцы каля вёскі Манастыр, размешчанай каля Адлерскага раёна Краснадарскага курорта

Постаці

# «ЗАВУСЯ Я ТОЛЬКІ — ЯНКА КУПАЛА»

## Сёння спаўняецца 135 гадоў з дня нараджэння першага народнага паэта Беларусі

**Гэты творца быў сапраўды НАРОДНЫМ: выхадзец з беднай сям'і, які рана спазнаў цяжкую працу і горыч страты блізкіх людзей, змог пераканаць усю нацыю ў сіле свайго таленту, заклікаць беларусаў да барацьбы за правы «людзьмі звацца». Купала быў не толькі паэтам, публіцыстам, які ўмеў стыльна апранацца і вёў часткова багемны лад жыцця, але і сапраўдным улюбёнцам публікі. Падтрымліваў маладых паэтаў, з адкрытай душой прымаў гасцей у сваім доме — здаецца, ён сапраўды адчуваў і ведаў беларускую душу. Таму і не дзіўна, што, паводле ўспамінаў сучаснікаў, пасля прэм'еры «Паўлінкі», якая прайшла ў Доме настаўніка ў Вільні, Купалу публіка літаральна насіла на руках. А яго «Тутэйшыя» і «Раскіданае гняздо» сталі сімваламі нацыі на многія пакаленні.**



Пачатак ХХ стагоддзя, час, у які Купала і прыйшоў у нашу нацыянальную літаратуру, быў унікальным перыядам. Тут спляліся галасы і памкненні многіх пакаленняў творцаў. Змяшаліся мастацкія стратэгіі і плыні. А сама літаратура за нейкія дзесяцігоддзі здолела прайсці шлях ад чыста народнага мастацтва, што стваралася стыхійна, як фальклор, да прафесійнай паэзіі, прозы, літаратуразнаўства. У многім — дзякуючы нястомнай, натхнёнай працы такіх таленатаў свайго часу, як Янка Купала.

### Рамантык? Рэаліст? Сімваліст?

Часам даследчыкі называюць паэмы «Сон на кургане» і «Курган» разам з некаторымі іншымі творамі Купалы гэтага ж жанру «чыста» рамантычнымі. Маўляў, і эстэтыка захоўваецца, і фальклорная аснова ёсць, і ўнутраны канфлікт галоўнага героя, яго бяссілле супраць грамадства і рэчаіснасці таксама ў іх прысутнічаюць. Але ўсё не так проста.

З аднаго боку, усё правільна. Беларуская літаратура пачатку ХХ стагоддзя завяршала фарміраванне класічных асноў мастацкай творчасці. Менавіта ў гэты час канчаткова сфарміраваліся вядучыя мастацкія кірункі літаратуры ХХ стагоддзя — рамантызм і рэалізм. Асабліва гэта датычыцца рамантызму, дакладней, неарамантызму, уласцівага новай гісторыка-літаратурнай эпосе.

Дарэчы, нават у пачатку ХХ стагоддзя паміж вядучымі тэарэтыкамі літаратуры таго часу (М. Багдановіч і А. Луцкевіч) не было згоды ў выкарыстанні тэрмінаў «мадэрнізм» і «неарамантызм», якія ў кантэксце беларускай літаратуры гэтага перыяду з'яўляюцца сінонімамі: паэт, перакладчык Максім Багдановіч, імкнучыся ўключыць наша краснае пісьменства ў сусветны літаратурны працэс, называе як адзін з яго мастацкіх кірункаў мадэрнізм. Крытык і публіцыст Антон Луцкевіч жа піша: неарамантызм. Менавіта ў рэчышчы неарамантызму адбывалася ў Беларусі пачатку ХХ стагоддзя станаўленне і развіццё нацыянальнай літаратурнай класікі. Рамантычныя ідэі і матывы прысутнічаюць у творчасці Янкі Купалы, Цёткі, Алеся Гаруна, Канстанцыі Буйло, Змітрака Бядулі, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага.

З іншага ж боку часта рамантычныя рысы ў літаратурах таго часу спалучаюцца з характэрнымі асаблівасцямі іншых мастацкіх сістэм (рэалізму, сімвалізму, імпрэсіянізму), што стварае непаўторнае паэтычнае адзінства, у якім і выяўляецца арыгінальнасць таленту аўтара. Ідэі сімвалізму прысутнічаюць і ў беларускай паэзіі, яны спалучаюцца з неарамантызмам (у творчасці Янкі Купалы) і імпрэсіянізмам (у Максіма Багдановіча). Адметна тое, што беларускі сімвалізм абапіраўся не толькі на еўрапейскую літаратурную традыцыю, а і на багаты мастацкі досвед нацыянальнага фальклору з яго дасканала распрацаванай паэтыкай сімвалаў і мастацкіх іншасказанняў. Вось адсюль — складаныя шматузроўневыя вобразы-алегорыі Купалы.

> **«Ён расказвае перш за ўсё пра людзей, пра іх пакутлівае, поўнае трагізму жыццё, пра пошукі народам вялікага скарбу — свабоды».**

Янка Купала рана захапіўся духам старажытнасці, які выразна адчуваўся ў духоўных набытках беларусаў. Калядкі, вяснянкі, кустовыя, купальскія песні, гэтак жа як і загаворы, замовы, нібы захоўвалі ў сабе адзнакі бачання, адчування свету далёкімі продкамі. Але ў той жа час, як піша Іван Навуменка, Купала не прайшоў міма пэўных мастацкіх формаў, выпрацаваных паэтамі-сімвалістамі і імпрэсіяністамі, яны мелі на яго бясспрэчны ўплыў. Купалу не трэба было выдумляць русалак, зданяў, бо гэтыя істоты ўжо існавалі ў міфах, казках, народных паданнях. Яны і сталі героямі яго твораў. Адзін з іх — паэма «Сон на кургане». Тут зварот да ўмоўна-фантастычнага, алегарычнага плана давае паэту магчымасць з'яднаць сённяшнюю яву з мінуўшчынай роднага народа. Малюнкі «У пушчы», «На замчышчы», з іх русалкамі, зданямі-відмамі, Чорным і, нарэшце, Самам, цэнтральным героем, заступнікам народа, праўдашукальнікам, — нібы нясуць подых мінуўшчыны, гісторыі.

Але не толькі звычайным для таго часу рамантычным пафасам, глыбокай трагедыяй Сама, галоўнага героя (які нагадвае героў «старога» рамантызму — людзей адзінокіх, мужных, але бяссільных перад воляй лёсу, няздольных дабіцца здзяйснення сваёй мэты) адметна паэма. У ёй значнае ўсё: месца дзеяння, вобраз, гук... Значнае і тое, якое ўражанне кожны з гэтых складнікаў робіць на чытача. Месца — стварае патрэбны настрой, гукі — зачароўваюць, нібы гіпнатызуюць, вобразы — палохаюць (у тым ліку абсурднасцю). Сімвалічныя месцы, дзе адбываецца дзеянне паэмы, — пушча, замчышча (падкрэсліваe слаўнае мінулае беларускага народа), папялішча, шынкоўня. Адметныя і героі паэмы — адзінокі Сам, жорсткія русалкі (кожная з іх расказвае сваю гісторыю жыцця, па сутнасці — баладу), кабета-вар'ятка, якая «сыйшла з розуму праз пажар», яе прыдуманае вяселле з Падростакм, сапраўднае вяселле, якое замест гасціннага дома прыязджае на папялішча... Адметны і вобраз Чорнага — злоснага дэмана, які сімвалізуе спрадвечныя перашкоды на шляху чалавека да шчасця. Менавіта з ім звязаныя самыя страшныя, гатычныя (а гэта таксама адна з рыс неарамантызму) сцэны паэмы, напрыклад, ён, абараняючы скарбы на замчышчы, кажа Саму:

*Зубамі грызі,*
*війся ў ранах,*
*Сэрцам бі ў камень,*
*як звонам,*
*Крывёю парог злі*
*цагляны,*
*Трупам тут ляж*
*безгалоўным.*

Надзвычай багатай з'яўляецца гукавая палітра паэмы. Толькі ўявіце: шэпт, свіст, бразганне золата, шэлест зарасляў, скрып... Да ўсяго гэтага напрыканцы паэмы дадаецца сумная песня Сама пад ліру: «канечна, мае голас ліра, / Бы толькі слухалі вы шчыра», затым «пачынаецца напяванне без слоў, каторае паволі ўсільваецца ў нейкую жудка-сумную, прыдаўленую мелодыю», і гэты спеў заглушае вясёлая мелодыя «Ой-ра, ой-ра», якую выконваюць музыкі ў карчме.

Як піша даследчык творчасці Янкі Купалы Міхаіл Ярош, асэнсаваць глыбіню праблематыкі «Сну на кургане» вельмі складана. Гэтую складанасць увесь час адчувала наша літаратуразнаўства, даючы самыя розныя трактоўкі ідэйнай сутнасці твора. Але апошнім часам яно зрушылася ў бок канкрэтна-гістарычнага вытлумачэння зместу паэмы. Напрыклад, ён сцвярджае, што «не фантастыка сама па сабе, не русалкі і відмы цікавяць паэта. Ён расказвае перш за ўсё пра людзей, пра іх пакутлівае, поўнае трагізму жыццё ў буржуазна-памешчыцкім грамадстве, пра пошукі народам вялікага скарбу — свабоды».

### Ля вытокаў паэзіі горада

У беларускай паэзіі пачынальнікам традыцыі мастацкага ўрбанізму лічыцца Максім Багдановіч, які ў сваім цыкле «Места» здолеў намаляваць яскравыя «карціны» тагачаснай Вільні, паказаць гукі горада і эпізоды яго жыцця. Але ж першым паэтам (у храналагічным плане), якога зачаравала Вільня, быў Янка Купала.

Запрашэнне ў Вільню, якое Янка Купала атрымаў восенню 1908 года, было для яго збавеннем ад вымушанага аднастайнага і нецікавага жыцця. Таму сустрэча з Вільняй была жаданай і чаканай, стала для паэта радаснай весткай. І сапраўды, творчасць гэтага перыяду сведчыла, што ён авалодаў красой і сілай роднага слова. І менавіта Вільня стала спрыяльным асяроддзем для жыцця і творчага росту маладога на той час паэта.

Старажытны горад не мог не зачараваць Янку Купалу таямнічасцю краявідаў. Гораду над «Вілейй» (Віліяй) паэт прысвяціў некалькі вершаў, што маюць падзагалоўкі «З віленскіх абразоў». Гара, на якой калісьці стаяў замак Гедзіміна, ажыўляла ва ўяўленні паэта карціны гісторыі і слаўных часоў беларускага народа, дазваляла яму, сапраўднаму рамантыку, адлюстраваць іх у вершы «Замкавая гара». У гэтым творы выяўляецца адчуванне Вільні як месца гістарычнага. Аўтарская канцэпцыя горада працуе на выкананне праграмы нацыянальнага беларускага адраджэння праз ідэалізацыю гістарычнага мінулага.

У вершы паэт супастаўляе прывід яркай міфічнай гісторыі Гедзімінавага кургана XIV стагоддзя і прафанічную сучаснасць ХХ стагоддзя з шэрай паўсядзённасцю яе гарадскога побыту. Лірычны герой аглядае гарадскі натоўп не з вяршыні гары, як гэта пазней зробіць дзядзька Антось з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» (раздзел «На Замкавай гары»), а стоячы каля яе падножжа. Цяпер пра былую славу старажытнага замка Гедзіміна нагадваюць толькі руіны: з аднаго боку, час прайшоў і знішчыў будынак, з іншага ж боку, усё на беларускай зямлі змянілася.

Як рамантык і прыхільнік нацыянальнага адраджэння, паэт рэагуе на тыя змены, што нячутна і незаўважна для іншых (уночы) адбываюцца ў грамадстве. Лірычны герой тут выступае як паэт-прарок у вобразе старонняга назіральніка, які нічым не вылучаецца з натоўпу, але ў той жа час памятае пра мінулае і прадчувае будучыню.

«Шуман» — верш, які таксама мае падзагаловак «З віленскіх абразоў», але выяўляецца ў ім зусім іншы бок існавання горада, іншы настрой ствараецца аўтарам. У віленскім кафэ «Шуман» Купала шмат часу праводзіў у вясёлай, хмельной кампаніі. Верш гэты сваім гучаннем, вобразнасцю і архітэктонікай падобны да песні — вясёлай, але, як заўсёды бывае, з ноткамі суму ў голасе. Так, у творы паэт апісвае звычайны вечар, што праходзіць у «Шумане»: «Рэжа музыка ахвоча // Песні, гоман — заадно, // Страва, карты, хто што хоча, // Льецца рэчкаю віно». Аўтар падкрэслівае, што гэта — не выпадковасць і не адзінкавы прыклад рэаліі жыцця ў Вільні: «Шуман» — Вільні кроў і косць, // Быў і будзе, як і ёсць». Заўважае пільнае вока лірычнага героя-назіральніка не толькі вонкавую весялосць, але і негатыўныя бакі існавання горада, гарадскога ладу жыцця. У вершы гучаць і ноткі смутку: лірычны герой сам цудоўна разумее, што марнаваць час за чаркай у вясёлай гарадской кампаніі — не выйсце.

> **Першым паэтам-урбаністам, якога зачаравала Вільня, быў Янка Купала.**

У вершы «На вуліцы» Купала малюе гарадскі начны пейзаж, звяртае ўвагу на дэталі, асаблівасці гарадской ночы, якія ён заўважае, пакуль блудзіць па «вуліцы, дзе сустрачаў яе». Гукі, што чуе лірычны герой у вечаровым горадзе, ствараюць у яго свядомасці жудасныя вобразы і асацыяцыі. Дрот, што віўся між слупамі, ён параўнаў з напятымі людскімі жыламі. Вецер гудзеў, «бы па дроце рэзаў нож; // Як вісельнік, выў, выраўшыся з-пад магілы», «цагляны мур сачыў за мною безупынку». Ды і да самога горада аўтар падбірае эпітэт «грэшны». Па ўсім настроі і вобразнасці верша відаць, што лірычны герой пачуваецца ў ім зусім няўтульна: «І чуўся я, як здрадай схопленая ў клетку лань...» Падчас прагулкі лірычны герой чуе музыку, а пад яе «бразджанне ног, грудзей хрыпенне». Ён абураецца супраць такога становішча рэчаў, адчувае сорам і расчараванне ў тым, што сам мае дачыненне да жыцця ў гэтым горадзе, між людзей, якія могуць бяздумна «...весяліцца // Не бачачы сваіх бяспутнасцей, што іх змаглі // І душаць адусюль, як змеяў навальніца!».

Складана расказаць пра Янку Купалу ў адным артыкуле. Яго творчасць, як бы банальна гэта ні гучала сёння, напраўду шматгранная. Яна натхняла многія і многія пакаленні беларусаў. І, думаецца, будзе натхняць і зачароўваць нашых паслядоўнікаў яшчэ не адно стагоддзе.

**Марына ВЕСЯЛУХА.**
vesialuha@zviazda.by

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, обращенного в доход государства (квартира в кп Нарочь)

| | Начальная цена, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
| **Лот №1:** Изолированное помещение (квартира, состоящая из двух жилых комнат, кухни, коридора, раздельного санузла, встроенного шкафа) с инв. № 633/D-1876, расположенное в 4 этажном кирпичном доме 1995 г. п. по адресу: Минская обл., Мядельский р-н, кп Нарочь, ул. Октябрьская, д. 6, кв. 32. Общая площадь – 50,4 м². Жилая площадь – 28,8 м². Назначение: Квартира. Число комнат: 2. | 35 460,00 | 3 540,00 |

ОБРЕМЕНЕНИЕ

Арест. Постановление главного следственного управления Следственного комитета Республики Беларусь о наложении ареста на имущество от 02.09.2013 №б/н. Арест будет снят после реализации Объекта с публичных торгов в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного на аукционе Объекта не позднее 20 (двадцати) рабочих дней с момента подписания протокола аукциона.
2. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
3. Переход права собственности на приобретенный на аукционе Объект недвижимости, обращенный в доход государства, осуществляется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

**Аукцион состоится 09.08.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона — 5%**

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.
Задаток перечисляется на р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, 220004, ул. Кальварийская, д. 4а, BIC банка BPSBBY2X. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже квартиры, проводимом 9 августа 2017 г.
Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу организатора аукциона: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 7. Окончание приема заявлений и задатков – 07.08.2017 в 11.00.
Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектом аукциона. Контактное лицо для осмотра Объекта аукциона — Коноплицкая Ольга Игоревна, тел. 8 (044) 529-28-38.
Организатор аукциона вправе снять лот с торгов по письменному указанию подразделения Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь в любое время до объявления его проданным

**☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 550-09-52, 8 (029) 356-90-03 ● www.ino.by ● e-mail: torgi@ino.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает об открытом аукционе по продаже жилого дома, Минская обл., Вилейский район, Ижский с/с, Вилейский район, д. Зольки

| | Начальная цена продажи, бел. руб. | Задаток, бел. руб. |
|---|---|---|
